Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№245 (28609)
20 СНЕЖНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 9–16



## Персанальная энцыклапедыя Скарыны

СТАР. 3



## Што абяцае капрамонт?

МС



## Калі канцавы прыпынак – не апошні

МС

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«Цяперашняя выбарчая кампанія праходзіць больш актыўна, чым мясцовыя выбары чатыры гады таму. Ініцыятыўных груп зарэгістравана па рэгіёнах прыблізна ў два разы больш, чым у папярэднюю кампанію. Сярод вылучэнцаў з'явілася шмат новых асоб. Павялічылася ў выбарках і колькасць прадстаўнікоў аб'яднанняў і палітычных партый, адзначаецца іх вялікая актыўнасць пры вылучэнні і зборы подпісаў. Гэта ўсё будзе спрыяць таму, што павялічыцца яўка выбаршчыкаў і, цалкам магчыма, выбарчая кампанія будзе праходзіць больш жыва і цікава, чым звычайна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0166 | ▼ |
| Еўра | 2,3785 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0722 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Дрэвы радасці



Фота БЕЛТА.

Па ўсёй краіне лясгасы пачалі нарыхтоўку ёлак для рэалізацыі насельніцтву і прадпрыемствам — у некаторых гарадах ужо распачаліся, у іншых — вось-вось пачнуцца ёлачныя кірмашы. Дрэўцы бяруць са спецыяльна выдзеленых для святочнай высечкі ўчасткаў, не наносячы шкоды прыродзе.

На здымку: ляснік Вільчыцкага доследна-вытворчага лясніцтва Магілёўскай вобласці Дзяніс ДРЫК выбірае чарговую прыгажуню, якая праз колькі дзён аздобіць чыйсьці дом.

■ Спецыяльны рэпартаж

## ХТО «ХАВАЕЦЦА» Ў АЎТО?

### Пра добрасумленных парушальнікаў, «ухілістаў» і звычайных кіроўцаў

Адзіны дзень спагнання запазычанасцяў з кіроўцаў-даўжнікоў цяпер штомесяц праходзіць у Беларусі. Гэта сумесныя рэйды супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі і судовых выканаўцаў Міністэрства юстыцыі. Пакуль першыя правяраюць правы і зімовую гуму, другія высвятляюць па базе даўжнікоў, ці не мае шафёр запазычанасцяў і неаплачаных штрафаў.

СТАР. 4




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

Як жа правесці навагоднія святы без пашкоджанняў?

## Ёлка павышанай рызыкі

Раніцай 28 снежня мінулага года сталічным ратавальнікам пачалі паступаць тэлефонныя званкі з аднаго і таго ж пад'езда 9-паверховага дома. На лесвічнай пляцоўцы людзі заўважылі моцнае задымленне. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца падзей, знайшлі ў кватэры дваіх малых дзяцей і 26-гадовую маці. Жанчына расказала, што калі яна зайшла ў пакой, то ўбачыла, як адкрытым полымем гарыць ёлка. Яна спрабавала самастойна справіцца з агнём, але сілы аказаліся няроўнымі. Пасля высветлілася, што пажар адбыўся з-за кароткага замыкання электрычнай гірлянды. Як жа правесці навагоднія святы з максімальнай бяспекай для сябе? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» даведаўся ў начальніка рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС Алены ДЗМІТРУК.

### Сакрэты выбару

Набыць сабе навагоднюю прыгажуню праблем няма — па краіне арганізаваны шматлікія ёлачныя кірмашы. З процiпажарнага пункту гледжання найлепшае натуральнае дрэва — тое, якое нядаўна ссеклі. Распазнаць гэта проста — ствол навобмацак у такіх дрэў ліпкі. А хвоя павінна быць зялёнай і ні ў якім разе не ападаць ад першага ж дотыку.

СТАР. 4

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

У першых нумарах 2018-га — календары: насценны, рэлігійны і народны

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!



# БЯРЭШ — АДДАВАЙ

## Кіраўнік дзяржавы правёў нараду па рэструктурызацыі даўгоў у эканоміцы

**Як канстатаваў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка, узровень назапашанай крэдытнай запазычанасці ў некаторых арганізацыях вялікі, гэта не дазваляе ім эфектыўна працаваць і развівацца.**

Выяўляюцца недапрацоўкі мінулых гадоў, пралікі ў бізнес-планаванні і дарагія грошы ў банкаўскай сістэме. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што толькі ў 2015 і 2016 гадах было прынята дзесяць рашэнняў па шэрагу прадпрыемстваў і галін на агульную суму звыш 1,8 млрд долараў.

— Былі рэструктурызаваны іх даўгі, даваліся растэрміноўкі і растэрміноўкі пагашэння запазычанасці па крэдытах, даваліся бюджэтныя займы, — нагадаў кіраўнік краіны. — Тады ўрад абяцаў, што калі мы дапаможам нашым прадпрыемствам, то гэта будзе апошні раз. Нам неабходна быў ў пункту гледжання ўрада нейкі штуршок, і яны пачнуць эфектыўна працаваць і вернуць даўгі.

Зараз прыйшоў час даўгі вяртаць, пагашаць пазыкі. Але зноў да Прэзідэнта паступае хваля прапаноў аб яшчэ адной рэструктурызацыі.

— Матывацыя тая ж: заклінанні, енчанні, плач. Мы сабе не можам дазволіць пастаянна перакладваць праблемы прадпрыемстваў і банкаў на бюджэт. Нам трэба сістэмна вызначыцца з гэтым пытаннем. Неабходны больш актыўны ўдзел банкаў у такіх працэсах. Але самым актыўным павінен быць той, хто браў грошы. Нам трэба прадугледзець дзейсныя меры аздараўлення фінансавай сітуацыі як на канкрэтных прадпрыемствах, так і ў галінах эканомікі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Каментуючы прапановы ўрада і Адміністрацыі Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ён не бачыць там адказнасці тых, хто браў у доўг. Кіраўнік дзяржавы ў гэтым ключы выказаў нараканні ў адрас кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта і Камітэта дзяржкантролю за тое, што яго не праінфармавалі своечасова па агучаных пытаннях.

— Урадам і Нацбанкам падрыхтаваны прапановы, што змяшчаюць нібыта шэраг навацый. З майго пункту гледжання гэта навацыі толькі па тэрміналогіі, — сказаў Прэзідэнт. — Таму хацеў бы пачуць адказы на пытанні зразумелай не толькі для тут прысутных, але і для ўсіх людзей мовай. Першае, што прадугледжваецца зрабіць для скарачэння аб'ёмаў праблемнай запазычанасці? Падругое, наколькі хутка механізм работы з праблемнымі даўгамі, якія прапануюць урад і Нацбанк, дазволіць выйсці прадпрыемствам з даўгавой ямы? Трэцяе, які эфект ад навацый будзе для рэальнага сектара эканомікі, бюджэту, банкаў?

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што чакае выразных адказаў на пытанні аб наступствах прадстаўленых прапаноў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### У тэму:

**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра, пасля нарады расказаў журналістам, што ў цэлым кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанаваны праект:**

— Сам указ носіць агульны характар, мы тут не гаварылі пра канкрэтныя прадпрыемствы, а разважалі пра стварэнне даўгавога рынку. Відаць, ні для кога не сакрэт, і экспертная супольнасць крытыкуе ўрад за тое, што мы не ўдзяляем увагі праблемам назапашаных даўгоў у рэальным сектары эканомікі, у першую чаргу дзяржаўных і камунальных арганізацый. Гэта не так. Мы вельмі ўважліва працуем з гэтым пытаннем. І гэта адзін з першых крокаў па стварэнні цывілізаванага даўгавога рынку ў Рэспубліцы Беларусь.

## Парламенцкі дзённік

### Як сябе праявіць дэкрэт?

**Паўтара дзясятка пытанняў абмеркавалі ўчора падчас чарговага пасяджэння трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Іх кола шырокае — ад тэрарызму і падаткаў да фізічнай культуры. Адным з першых сенатары прынялі да ведама Дэкрэт Прэзідэнта №7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».**

**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі,** прадстаўляючы дэкрэт, адзначыў, што дакумент мінімізуе ўмяшанне дзяржавы ў работу суб'ектаў гаспадарання. Пры гэтым узмацняюцца механізмы самарэгулявання бізнесу і яго адказнасць за бяспечную работу. Дэкрэтам таксама вызначаны пералік асобных найбольш распаўсюджаных відаў эканамічнай дзейнасці, пачатак здзяйснення якіх будзе адбывацца ў паведамляльным парадку. У яго ўключаны бытавыя, турыстычныя паслугі, дзейнасць у сферы гандлю і грамадскага харчавання, перавозак пасажыраў і багажу, вытворчасць сельгаспрадукцыі, будаўнічых матэрыялаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

### Прывабнасць айчыннага

**У першым чытанні прыняты папраўкі ў закон «Аб інвестыцыях». Асаблівасць законапраекта заключаецца ў тым, што ён быў унесены ў Палату прадстаўнікоў самімі дэпутатамі — Уладзіславам Шчэпавым і Аляксеем Сокалам.Нова ўвядзенні, якія прапануюцца ў дакуменце, скіраваныя на паляпшэнне дзелавога асяроддзя, павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці, а таксама забеспячэнне гарантый правоў прыватнай уласнасці.**

Якія ж дапаўненні і змяненні змяшчае законапраект? Па-першае, у закон аб інвестыцыях дадалі артыкул, згодна з якім вызначаецца агульны парадак і ўмовы кампенсацыі інвестару коштаў маёмасці, якая з'яўляецца інвестыцыямі або ўтвараецца ў выніку ажыццяўлення інвестыцый, пры нацыяналізацыі або рэквізіцыі гэтай маёмасці. Па-другое, прадугледжваецца ўзаемная адмова дзяржаў ад юрысдыкцыйнага імунітэту ў адносінах да спрэчак з прыватнымі асобамі іншай дзяржавы. На дадзены момант гэты аспект урэгуляваны часткова ў артыкуле закона «Аб канцэсіях». Па-трэцяе, законапраектам прадугледжана ўдакладненне абавязковых умоў інвестыцыйных дагавораў, сярод іх — аб'ект, аб'ём, крыніцы інвестыцый, правы, абавязкі бакоў, адказнасць.

У другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2018 год». Для яго разліку былі прыняты кансерватыўны сцэнарый знешніх умоў, пры якім тэмп росту ВУП Беларусі складзе 101,2%, а сярэднегадавыя параметры: інфляцыя — 107,4%, курс долара — 2,038 беларускага і 62,3 расійскага рубля, стаўка рэфінансавання — 11% гадавых, а цана на нафту — 43 долары за барэль.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## Нацыянальнай спецслужбе — 100 гадоў

**Сёння кіраўніцтва, асабовы склад, ветэраны органаў дзяржаўнай бяспекі Беларусі прымаюць віншаванні не толькі з нагоды прафесійнага свята, але і ў сувязі са 100-годдзем з дня заснавання органаў дзяржаўнай бяспекі.**

«У слаўным векавым летапісе нацыянальнай спецслужбы ёсць нямала яркіх старонак, напоўненых легендарнымі імёнамі, прыкладамі сапраўднага патрыятызму, крыштальнай сумленнасці, бездакорнага выканання службовага абавязку і гатоўнасці да самаахвяравання», — адзначыў у сваім віншаванні Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама заўважыў, што цяперашняе пакаленне супрацоўнікаў дастойна выконвае свой абавязак, забяспечваючы надзейную абарону беларускай дзяржавы. Залогам поспеху служаць прафесіяналізм і падрыхтаванасць кадраў, высокі інтэлектуальны і тэхнічны патэнцыял органаў дзяржбяспекі. Асаблівыя словы ўдзячнасці ў гэты дзень адрасуюцца ветэранам, якія застаюцца прыкладам вернасці прысязе, сапраўднымі настаўнікамі, чый бясцэнны вопыт заўсёды запатрабаваны.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў усім супрацоўнікам і ветэранам КДБ міру і здароўя, каб іх прафесійныя поспехі спалучаліся з сямейным дабрабытам і асабістым шчасцем.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## Наша марка

### Пакажам сябе

#### Айчынныя прадпрыемствы збіраюцца ўдзельнічаць у сусветнай выстаўцы ў ААЭ

**Экспазіцыя беларускіх вытворцаў «Made in Belarus» будзе арганізавана ў рамках ключавой спецыялізаванай выстаўцы прадуктаў харчавання і напояў Gulfood, якая пройдзе ў Дубаі (ААЭ) з 18 па 22 лютага 2018 года. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў прэсслужбе выставачнага прадпрыемства «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.**

Выстаўка Gulfood уваходзіць у тройку найбуйнейшых штогадовых сусветных выставак харчовых тавараў. Беларусь на ёй будуць прадстаўляць «Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат», «Калінкавіцкі малочны камбінат», «Лідскі малочна-кансервавы камбінат», «Ашмянскі сыраробны завод» філіял ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат», «Слонімскі мясакамбінат», «Мінскі малочны завод №1», «Чырвоны харчавік», «Беллакт». Прыём заявак на ўдзел працягваецца.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*


**ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 24 января 2018 года в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20 открытого аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства**

| № лота | Наименование объекта | Уполномоченный орган | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. №331/С-(данных нет) площадью 463,3 кв. м (h-9,50м)**, назначение – нет сведений, наименование – **сооружение разборное из металлоконструкций**. Местонахождение: **РБ, Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. Ю. Гагарина, д. 17Б/4.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **321450100003000141** общей площадью **7,5807 га (право постоянного пользования)**. Целевое назначение земельного участка: **земельный участок для обслуживания производственной базы** | ИМНС РБ по Мозырскому р-ну | **69 120,00** | 6 912,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. №331/С-(данных нет) площадью 1 085,1 кв. м (h-9,50м)**, назначение – нет сведений, наименование – **арочник, сооружение, разборное из металлоконструкций**. Местонахождение: **РБ, Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. Ю. Гагарина, д. 17Б/6.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **321450100003000141** общей площадью **7,5807 га (право постоянного пользования)**. Целевое назначение земельного участка: **земельный участок для обслуживания производственной базы** | ИМНС РБ по Мозырскому р-ну | **143 748,00** | 14 374,80 |

**Шаг аукциона – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 декабря 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22 января 2018 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) **не позднее 20 (двадцати) рабочих дней** с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем (единственным участником) аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, соответствующим Департаментом по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 (двадцать) рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по оплате предмета торгов. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства (Указ Президента РБ от 19.02.2016 г. №63). **Примечание: земельный участок под объект продажи будет сформирован согласно законодательству РБ покупателем после приобретения капитального строения самостоятельно. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### На выбарах у Каталоніі шанцы прыхільнікаў і праціўнікаў незалежнасці практычна роўныя



Пазачарговыя парламенцкія выбары пройдуць 21 снежня ў Каталоніі. Рашэнне аб скліканні волевыяўлення было прынята цэнтральным урадам пірэнэйскага каралеўства ў сувязі з найбуйнейшым у дэмакратычнай гісторыі краіны крызісам. Цяпер рэгіянальныя палітычныя сілы падзяліліся галоўным чынам на два блокі: прыхільнікаў і праціўнікаў незалежнасці. Паводле апошніх апытанняў грамадскай думкі, галоўныя прэтэндэнтамі на перамогу па выніках аўтаномных выбараў з'яўляюцца «Левыя рэспубліканцы Каталоніі» і «Грамадзяне». Тым не менш ні адна палітычная сіла не зможа атрымаць абсалютную большасць у 135-месным парламенце, каб самастойна сфарміраваць урад.

### Названыя галоўныя рызыкі для свету на наступнае дзесяцігоддзе

СМІ апублікавалі «Інструкцыю песіміста» з галоўнымі рызыкоўнымі сцэнарыямі да 2028 года. У топ-5 галоўных рызык на наступныя 10 гадоў прысутнічаюць: перамога Дональда Трампа на выбарах прэзідэнта ЗША ў 2020 годзе, распаўсюджванне фэйкавай інфармацыі ў інтэрнэце, замена звыклых грошай біткойнамі, абвяшчэнне вайны Паўночнай Карэяй, а таксама замена бензінавага паліва аўтамабіляў электрычнасцю. Акрамя гэтага, у найбліжэйшыя 10 гадоў Еўропа можа сутыкнуцца з «вайной пакаленняў» — людзей пенсійнага ўзросту стане значна больш, і працаздольнае насельніцтва не зможа іх забяспечваць. Беспрацоўе сярод маладога пакалення вырасце да 50%. Пры гэтым агенцтва падкрэслівае, што пералічаныя варыянты развіцця падзей не прагноз, а спосаб прымусіць людзей задумацца пра тое, як хутка можа мяняцца свет.

### Складзены рэйтынг мільярдэраў, якія летась багацелі найбольш хутка

Часопіс Forbes склаў рэйтынг уладальнікаў самых хуткарослых капіталаў у 2017 годзе. На першым месцы ў спісе — заснавальнік і кіраўнік інтэрнэт-кампаніі Amazon Джэф Безас, яго актывы падаражэлі на 33,8 мільярда долараў — да $98,6 млрд. Другое месца заняў уладальнік Evergrande Group Сюй Цзяінь. Агульны кошт яго актываў за год вырас на 27,4 мільярда долараў і склаў $36,5 млрд. На трэцім радку — прэзідэнт Louis Vuitton Бернар Арно. У 2017 годзе ён разбагацеў на 23,6 мільярда долараў — да $40,3 млрд. Амерыканскі Institute for Policy Studies у лістападзе падлічыў, што сукупны капітал трох найбагацейшых грамадзян ЗША — Безаса, Гейтса і інвестара Уорана Бафета — большы, чым агульны капітал беднейшай паловы насельніцтва Штатаў (160 мільёнаў чалавек).

### Пад ЗША выявілі велізарную бурбалку з магмы



Геафізікі Ратгерскага ўніверсітэта (ЗША) выявілі, што пад амерыканскім штатам Вермонт размяшчаецца велізарная бурбалка расплаўленых парод дыяметрам 400 кіламетраў, якая паступова падымаецца да паверхні. На думку спецыялістаў, у будучыні яна можа спарадзіць вулканы ў адносна стабільным рэгіёне. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert. Даследчыкі выкарыстоўвалі сістэму Earthscope — сетку, якая складаецца з больш чым тысячы прыбораў, што рэгіструюць сейсмічную актыўнасць па ўсім паўночнаамерыканскім кантыненце. Навукоўцы выявілі тэрмічную анамалію, якая была на сотні градусаў больш гарачай, чым навакольная парода ў верхняй мантыі.

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
НАПАЧАТКУ БЫЛО Слова

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ БЫ ВІШАНЬКА НА ТОРЦЕ

**Мы цэлы год святкавалі 500-годдзе беларускага кнігадрукавання выданнямі, выстаўкамі, канферэнцыямі, прэзентацыямі, навуковымі канферэнцыямі, нават тэатральнымі пастаноўкамі, згадвалі Францыска Скарыну на ўрачыстасцях, прэзентацыях і ва ўласных дамах, даведваліся новыя факты з жыцця першадрукара і бачылі ў ім нацыянальны сімвал. А ўчора нам паведамілі пра чарговае ў гэтай тэме, але надзвычайнае выданне — персанальную энцыклапедыю «Францыск Скарына», над якой працавала каля ста пяцідзесяці аўтараў і якая ўмясціла ў сябе больш за тысячу артыкулаў.**

Дзяржаўныя выдавецтвы за 2016—2017 гады прымеркавалі да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання больш за дваццаць кніжных праектаў. «За паўтара года мы выпусцілі дванаццаць прысвечаных беларускаму кнігадруку выданняў агульным тыражом васямнаццаць тысяч экзэмпляраў», — паведаміў **дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.**

У гэтым жа выдавецтве пабачыла свет і персанальная энцыклапедыя «Францыск Скарына», свежыя асобнікі якой ужо ўчора паказалі журналістам. Па словах **навуковага рэдактара энцыклапедыі і намесніка дырэктара па навуковай і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Алеся СУШЫ,** праца над выданнем ішла два гады, а шлях да яго — каля васьмі. За гэты час трэба было вызначыць, ці дарасло сучаснае скарыназнаўства да паўнавартаснага збору артыкулаў, які б умясціў тое, чаго дагэтуль у друку яшчэ не было. Аказалася — дарасло.

«Адзін з найлепшых даведнікаў пра Скарыну выйшаў трыццаць гадоў таму. Калі адбылося наша першае абмеркаванне зместу будучай энцыклапедыі, узніклі сумненні, ці зможам мы скласці такі калектыў, які б асіліў працу. У выніку, калі працэс ужо пайшоў, пачалася ледзь не бойка за права быць аўтарам энцыклапедыі, а на многія тэмы выстройвалася чарга з тых, хто мог бы выступіць у ролі эксперта. Сам па сабе гэты факт ёсць найлепшае сведчанне навуковай спеласці і гатоўнасці беларусаў да асэнсавання сваёй спадчыны», — расказаў Алесь Суша.

Такім чынам, у прадстаўленай кнізе сабраныя напрацоўкі апошніх гадоў дзясяткаў беларускіх і замежных аўтараў і абагульнены ў сціслай, але насычанай форме, а такі рэдкі для айчыннай навуковай і выдавецкай справы фармат, як персанальная энцыклапедыя, нарэшце аказаўся прысвечаны Францыску Скарыну.



Фота БЕЛТА.

Як вядома, напярэдадні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання па ініцыятыве Міністэрства інфармацыі быў створаны аргкамітэт, які распрацаваў план прымеркаваных да свята падзей. Тэма ў выніку знайшла адлюстраванне на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, у свяце «Александрыя збірае сяброў», Дні беларускага пісьменства ды іншых. А ўжо заўтра ў Нацыянальнай бібліятэцы адбудзецца фінальнае мерапрыемства пад назвай «Святло Скарыны», дзе паспрабуюць падвесці вынік паўтарагадовай скарыніяны.

**Сафія КІСЯЛЁВА.**

## Здарэнні

### Выратаваў з агню трох чалавек

**Позна ўвечары ратавальнікам паступіла паведамленне аб пажары ў доме ў вёсцы Доўнары Іўеўскага раёна. Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, ён гарэў адкрытым полымем, дах часткова абрынуўся ўнутр.**

Па інфармацыі МНС, гаспадар жылля 1988 года нараджэння пражываў сумесна з дзядзькам 1974 года нараджэння і дзядулем 1935 года нараджэння. Да прыбыцця ратавальнікаў відавочцам былі выратаваны тры чалавекі.

Высветлілася, што міма праязджаў мужчына, убачыў гарэнне, спыніўся і накіраваўся да хаты. Каля ўваходных дзвярэй ён пачуў крыкі аб дапамозе і забег у пабудову. На падлозе ў калідоры знайшоў ляжачага мужчыну 1978 г. н. (знаходзіўся ў гасцях). Узяўшыся за вопратку пацярпелага, выцягнуў яго на вуліцу. Затым забег у дом і знайшоў у калідоры на падлозе пенсіянера. Таксама выцягнуў таго з пабудовы. Вярнуўся ў дом чарговы раз, знайшоў у калідоры дзядзьку гаспадара жылля, якога таксама выцягнуў на двор. Пасля мужчына яшчэ раз паспрабаваў увайсці ўнутр, але з-за высокай тэмпературы трапіць у пакой, дзе пасля быў знойдзены загінулы гаспадар дома, ён не змог. Як мяркуецца, прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні.

### «Багач Алік» выманіў 52 тысячы рублёў

**У сталічную міліцыю паступіла заява ад грамадзянкі, якая пацярпела ад махлярскіх дзеянняў мужчыны пад псеўданімам Багач Алік. Па інфармацыі Маскоўскага РУУС г. Мінска, шляхам падману і злоўжывання даверам ён завалодаў грашыма ў памеры 52 тысячы рублёў, якія належалі пацярпелай.**

Жанчына расказала, што ў чэрвені ў інтэрнэце яна пазнаёмілася з мужчынам пад нікам Багач Алік. Падчас перапіскі той прапанаваў мінчанцы інвеставаць грошы ў прыбытковы бізнес. Мужчына і жанчына сустрэліся, абмеркавалі ўсе нюансы будучай здзелкі і ў той жа дзень афармілі на імя грамадзянкі шэсць крэдытаў у розных банках на суму 52 тысячы рублёў. Усе грошы жанчына перадала новаму знаёмаму. Па першым часе той спраўна плаціў узносы па крэдытах, аднак неўзабаве заяўніцы пачалі паступаць званкі з банкаў з просьбай пагасіць запазычанасці. Пасля гэтага яна і звярнулася ў міліцыю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Карысныя ініцыятывы

# Камп'ютарная гульня дапаможа ў рэабілітацыі,

## а печыва з морквы выратуе бяздомных жывёл

**Чалавек з інваліднасцю зможа праходзіць рэабілітацыю, проста надзеўшы акуляры віртуальнай рэальнасці, з выкінутых пластыкавых бутэлек будуць вырабляць лаўкі для паркаў, а зняволеныя і іх сваякі змогуць перапісвацца праз інтэрнэт. Не, гэта не навіны з Амерыкі — усе гэтыя ідэі ў хуткім часе будуць рэалізаваны ў нашай краіне. Расказваем пра самыя цікавыя сацыяльныя праекты, якія былі прадстаўлены ў фінале конкурсу Social Weekend.**

### ЗДАРОЎЕ Ў КУБЕ

Гран-пры атрымаў праект VR Health — ён дапамагае ў рэабілітацыі пацыентаў з расстройствамі функцыі раўнавагі. Вучыцца нанова кіраваць сваім целам чалавек з ДЦП ці пасля інсульту будзе, знаходзячыся ў віртуальнай рэальнасці.

Такую рэабілітацыю можна праходзіць як у паліклініцы, так і дома. Усё абсталяванне, якое спатрэбіцца, — гэта камп'ютар, акуляры віртуальнай рэальнасці і спецыяльная праграма. Што адметна, практыкаванні па рэабілітацыі будуць выконвацца ў выглядзе гульняў: пацыент водзіць па візуальным экране нейкага персанажа і, калі спраўляецца з прапанавым заданнем, пераходзіць на наступны ўзровень. Так чалавек не будзе ўспрымаць практыкаванні як сур'ёзную медыцынскую працэдуру і зможа на час забыць пра сваю праблему.

Беларуская распрацоўка — даступны варыянт для ўстаноў аховы здароўя. Па ацэнках, яе цана складзе прыкладна паўтары тысячы долараў (а тое замежнае абсталяванне для рэабілітацыі, якое цяпер стаіць у нашых стацыянарах, каштуе ад 15 да 200 тысяч еўра). У распрацоўцы ўдзельнічалі праграмісты і ўрачы з РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі. Калі ўстройства пройдзе выпрабаванні і інструкцыя аб яго выкарыстанні будзе зацверджана ў Міністэрстве аховы здароўя, яго змогуць устанаўліваць у медцэнтрах і здаваць у арэнду.

Іншы праект пра здароўе — cardio.today — расказвае пра раннюю прафілактыку сардэчна-сасудзістых захворванняў. Па статыстыцы, 15—16 тысяч беларусаў у год трапляюць у стацыянар з інфарктам міякарда. Каманда праекта збіраецца запусціць серыю брашур «Бібліятэка сардэчніка», каб расказваць, як вярнуцца да нармальнага жыцця людзям пасля інфаркту, а лепш — папярэдзіць яго. І стварыць мабільны пункт «Здароўе ў кубе», дзе можна будзе ўзважыцца, памераць ціск, здаць аналіз крыві (спачатку такі бокс будзе «калясіць» па IT-кампаніях).

**Дарэчы**

Ужо пачаўся прыём заявак на наступны конкурс Social Weekend. Падаць ідэю можна да канца лютага 2018 года. Калі вы ведаеце, як змяніць жыццё ў роднай вёсцы, горадзе ці цэлай краіне да лепшага, гэта выдатны шанц паспрабаваць рэалізаваць сваю задуму.

### «ВЕСТАЧКА» РОДНЫМ

Інтэрнэт-сэрвіс «Вестачка», які дапаможа аператыўна дастаўляць лісты і пасылкі ў папраўчыя ўстановы, прыдумалі два праграмісты. Сваякі зняволеных змогуць адпраўляць пісьмы анлайн: тэкст будзе аўтаматычна праходзіць папярэднюю цэнзуру на забароненыя словы і маўленчыя звароты, потым раздрукоўвацца непасрэдна ў самой калоніі ці турме і перадавацца адрасату. Так аптымізуецца працэс і скарачаецца работа цэнзара. Сэрвіс таксама дасць магчымасць фарміраваць пасылкі з таго асартыменту, што ёсць у краме пры папраўчай установе. Адпраўнік выбірае тавары, аплачвае іх, і заяўка паступае ў магазін. Сваякам не прыйдзецца кожны раз ехаць за сотню кіламетраў, каб перадаць пасылку з прадуктамі.

Па словах стваральнікаў праекта, цэны будуць параўнальныя з тымі, якія ўстаноўлены на паштовыя паслугі. За дадатковую плату можна будзе пераслаць фота ці атрымаць пісьмо ў адказ (у гэтым выпадку ліст, састаўлены зняволеным ад рукі, адскануюць і адправяць вам на электронную скрыню).

У Расіі і ЗША, дарэчы, падобныя праекты ўжо існуюць. Плюс анлайн-сэрвісаў у тым, што сваякі і зняволеныя могуць больш кантактаваць, што спрыяе сацыялізацыі апошніх. Цяпер вядуцца перамовы з Дэпартаментам выканання пакаранняў МУС. Там ідэю ўспрынялі пазітыўна і гатовы пратэставаць на адной з папраўчых устаноў. Чакаецца, што сайт запусціцца праз два месяцы.

### БОЙ ПЛАСТЫКУ

Штогод у Беларусі ўтвараецца больш за тры мільёны тон бытавога смецця. І, па звестках Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, з кожным годам гэты аб'ём узрастае на 20 працэнтаў. Смеццеперапрацоўчыя прадпрыемствы спраўляюцца толькі з 339 тысячамі тон адходаў у год. Астатнія 2,6 мільёна тон проста хаваюць на спецыяльных палігонах. 90 працэнтаў пакетаў і бутэлек па-ранейшаму аказваюцца на звалцы і не прымяняюцца для паўторнага карыстання.

Што рабіць? Аўтары праекта «Zaduma» хочуць уставіць машыны, якія будуць перапрацоўваць непатрэбны пластык, сабраны ў насельніцтва, у розныя вырабы. Механізм просты. Спачатку пластык драбніцца ў спецыяльным апараце — шрэдары. А потым гэта маса з дапамогай, напрыклад, 3D-прынтара пераўтвараецца ў новыя аб'екты. Можна выпускаць самыя розныя рэчы — ад мыльніц да лавачак для гарадскіх паркаў.

Простае і пры гэтым кардынальнае рашэнне праблемы «засілля» поліэтыленавых пакетаў прапануюць стваральніцы адукацыйна-рукадзельнага праекта «Торба Шоу». Замест таго каб кожны раз браць пакет на касе, насіце з сабой тканінную эка-сумку. Па-першае, гэта стыльны аксесуар, які не будзе псаваць ваш вобраз. А па-другое, адна торба праслужыць вам мінімум два гады і заменіць — толькі ўявіце! — 400 пакетаў.


Падчас майстар-класа па пашыве эка-торбаў.

«Торба Шоу» ладзіць бясплатныя майстар-класы, на якіх вучаць шыць эка-сумкі і жыць у эка-стылі. За мінулы год дзяўчаты правялі 12 сустрэч, на якіх стварылі каля 150 торбаў. Цяпер яны збіраюцца наладзіць іх вытворчасць і далейшы продаж у сталічных гіпермаркетах. У кожнай сумцы будзе адмысловы ўкладыш з інфармацыяй пра экалогію. Каб высветліць, колькі мінчане гатовы заплаціць за эка-аксесуар, дзяўчаты правodзілі апытанне. Цана торбы не перавысіць 10 рублёў.

— У 40 краінах свету поліэтыленавыя пакеты ўжо забаронены. Мы хочам, каб і ў нас гэта праблема стала вартай увагі, — кажуць аўтары праекта Аляксандра Кульбіцкая і Кацярына Арчакова.

### САЦЫЯЛЬНАЯ ПЯКАРНЯ

Карысныя дэсерты для сабак збіраецца выпускаць каманда праекта з вясёлай назвай «Мопс-Шмопс». У печыве і кексах для гадаванцаў не будзе цукру, солі і кансервантаў. Замест пшанічнай мукі — грэцкая, жытняя, рысавая. А саладосці дэсертам дабавяць морква і парашок ражковага дрэва. У асартыменце будзе і печыва з мясам, а пазней, магчыма, нават тарты.

Але самае цікавае не гэта. Праект будзе вырашаць адразу некалькі сацыяльных задач. У пякарні створаць працоўныя месцы для людзей з інваліднасцю і дадуць ім магчымасць зарабляць на жыццё. А частка выручкі будзе накіроўвацца зоаабарончым арганізацыям, якія ратуюць бяздомных жывёл.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ХТО «ХАВАЕЦЦА» Ў АЎТО?



Юліян МІСЮКЕВІЧ, кансультант галоўнага ўпраўлення прымусовага выканання Міністэрства юстыцыі Беларусі перад пачаткам рэйду адказаў на пытанні журналістаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Карэспандэнты «Звязды» вырашылі на ўласныя вочы ўбачыць, як выглядаюць рэйды на сталічных вуліцах, і накіраваліся ў Партызанскі раён сталіцы.

## Калі б ведаў — заплаціў бы

Інспектар ДАІ спыняе выбраны аўтамабіль, правярае дакументы і стан аўтамабіля. Пасля судовыя выканаўцы запрашаюць чалавека да сябе ў машыну. Тут праз базу праграмы «АІС ПРВ» (аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма органаў прымусовага выканання) высвятляюць, ці няма ў кіроўцы даўгоў.

— Падобныя мерапрыемствы разлічаны перш за ўсё на тое, каб павысіць колькасць аплачаных грамадзянамі запазычанасцяў, — заўважыў **Міхаіл ГАСТЭЛА, загадчык сектара аддзела прымусовага выканання (АПВ) Партызанскага раёна г. Мінска.** — Людзі пабачаць, што інспектары і судовыя выканаўцы працуюць разам на вуліцы. Магчыма, гэта падштурхне некаторых пазбавіцца ад сваёй запазычанасці.

За першыя паўгадзіны спынілі чалавек восем. Усё чыста — адказныя кіроўцы трапіліся. Рэагуюць часцей за ўсё са здзіўленнем. Мала што іх спынілі, дык яшчэ і сустракаюць дружным «натоўпам» з шасці чалавек.

Вось дзяўчына ў чырвонай куртцы пытаецца, што адбываецца, пакуль чакае сваёй чаргі трапіць у машыну да судовых выканаўцаў. Тлумачым пра рэйд. Яна робіць вялікія вочы і кажа: «Нават цікава. Добра, што ў мяне ўсё ў парадку».

У гэты час з машыны супрацоўнікаў Мінюста выходзіць з непаразуменнем у вачах і ўсмешкай на твары мінчанін Дзяніс:

— Я і не ведаў, што ў мяне чатыры штрафы за перавышэнне хуткасці. Магчыма, лісты і прыходзілі, але з мяне такі хадок на пошту... Я рана ўстаю і позна прыходжу, дык і скрыню не правяраў паштовую. Мяне амаль не бывае ў Мінску, і я проста мог прапусціць гэта. Я адразу аплачу бы, калі б ведаў, што ёсць штрафы.

Дарэчы, кожны чалавек можа сам праверыць сябе на існаванне запазычанасцяў, калі ўвядзе ўласнае імя ў праграму «АІС ПРВ». «Думаю, цяпер з раз на месяц буду таксама «рэйды» па гэтай базе рабіць і правяраць», — усміхаецца Дзяніс і ідзе ў банк плаціць штраф.

## І легкавік, і КАМАЗ

Добрасумленныя парушальнікі самі правяраюць на сайце Міністэрства ўнутраных спраў, ці выпісаны ім штраф. Нават калі яны не заўважылі бляск фотакамеры і не маюць падставы лічыць сябе вінаватымі, расказвае **Вікторыя ТУПКО, загадчык сектара АПВ Партызанскага раёна г. Мінска.**

— Здараецца, калі да нас прыходзіць дакумент аб перавышэнні чалавекам хуткасці, штраф ужо аплачаны парушальнікам, — дадае **Алеся КУРЛОВІЧ, судовы выканаўца АПВ Партызанскага раёна г. Мінска.**

Супрацоўнікі ДАІ спыняюць не толькі легкавыя, але і грузавыя аўто і фуры. Правяраюць усіх, акрамя кіроўцаў гарадскога пасажырскага транспарту.

— У кожны перыяд свае задачы і планы праверкі. Розныя сустракаюцца парушэнні, — адзначае **Аляксандр ДЗЯКОВІЧ, дзяржаўтаінспектар Партызанскага РУУС г. Мінска.** — І без тэхагляду ездзяць, і без дакументаў. Калі правы ў чалавека адабраныя, аўто адразу на штрафстаянку адпраўляецца. Калі правы проста не пры сабе, кіроўца атрымлівае папярэджанне ці штраф да пяці базавых велічынь і едзе далей.

У шафёра спыненага КАМАЗа, напрыклад, не аказалася тэхпашпарта на машыну і выявіўся неаплачаны штраф. Пакуль кіроўца расплачваўся, прыехаў яго дырэктар і прывёз патрэбныя дакументы.

— Пакаранне за праезд без дакументаў — ад папярэджання да 0,5 базавай велічыні штрафу, — каментуе інспектар Аляксандр Дзяковіч. — Гэтаму кіроўцу мы выпісалі штраф.

Следам спынілі маршрутку. Яе кіроўца Дзмітрый з Сенніцы Мінскага раёна паставіўся да гэтага з разуменнем:

— Гэта правільна, трэба шукаць парушальнікаў і такім чынам. Страх будзе ў тых, хто мае даўгі, напэўна. А хто чысты перад законам, — чаго яму баяцца?

Наступны спынены намі шафёр, правераны па базе даўжнікоў, нічога не вінен дзяржаве. Аднак па яго прозвішчы праграма выдала запазычанасці яго брата: пяць розных выканаўчых вядзенняў. Толькі адзін доўг — 1056 рублёў, другі — 202 — агульны памер досыць буйны.

— Такія рэйды карысныя яшчэ і тым, што спыненыя кіроўцы адзін аднаму будуць перадаваць, мяркую, судовыя выканаўцы і на дарозе сустракаюцца. Тады яны задумаюцца аб аплаце штрафаў, інфармацыя пойдзе, што называецца, у народ. І вынік будзе, але не адразу. Паездзім раз, другі, трэці, і свядомасць людзей узрасце, — упэўнена **Людміла КАБЫЧКІНА, начальнік аддзела прымусовага выканання Партызанскага раёна г. Мінска.**

А вось элітная з выгляду машына без тэхагляду, зарэгістраваная на камерцыйную кампанію. Сам кіроўца, акрамя адсутнасці тэхагляду, мае крымінальнае спагнанне, па якім штомесяц палова яго заробку ідзе на выплату дзяржаве сарака тысяч рублёў, якія ён вінен, згодна з рашэннем суда, за ўхіленне ад падаткаў. Мужчына з такім рашэннем не згодны, але мусіць плаціць.



Рэйд пачаўся. Супрацоўнік ДАІ патрабуе, каб кіроўца спыніўся.

Арышт накладзены і на аўто, кошт якога вырашана абярнуць у залік спагнання доўгу. Аднак шафёр сцвярджае, што гэта судовая памылка, бо маёмасць належыць не яму, а фірме. Ужо пададзены іск аб аспрэчванні прыналежнасці маёмасці.

За адсутнасць тэхагляду кіроўцу выпісалі штраф, што ў яго выпадку можа дрэнна паўплываць на яго становішча, паколькі праз крымінальную запазычанасць ён знаходзіцца на «хатняй хіміі», са шкадаваннем кажа інспектар ДАІ. Дырэктар фірмы, якой належыць аўтамабіль, таксама будзе аштрафаваны за допуск да кіравання машынай, якая не прайшла тэхагляд.

## Вінен — нікуды не едзеш

Асабліва ўпартыя «ўхілісты» рызыкуюць пасля праверкі працягнуць шлях пешшу, бо аўто адбуксіруюць у залік спагнання запазычанасці. Пастанаўленне аб затрыманні і адбуксіроўцы аўтамабіля дзейнічае на тэрыторыі ўсёй краіны. Нават калі даўжнік жыве ў Мінску, а судовыя выканаўцы затрымалі яго ў Брэсце, машыну могуць адабраць, калі ў ДАІ будзе ў наяўнасці выканаўчы ліст.

За 10 месяцаў 2017-га ў органы прымусовага выканання паступіла каля 260 тысяч пастанаўленняў органаў ДАІ аб перавышэнні хуткаснага рэжыму, зафіксаваных камерамі фотафіксацыі. Летась за ўвесь год іх было 252 тысячы. Амаль палова «гоншчыкаў» — жыхары Мінска. Разам з тым выконваецца 85—90% спраў дадзенай катэгорыі.

Каб не пазбавіцца аўто проста на дарозе, **Юліян МІСЮКЕВІЧ, кансультант галоўнага ўпраўлення прымусовага выканання Міністэрства юстыцыі,** раіць даўжнікам такое выйсце. Непасрэдна на месцы затрымання супрацоўнікамі ДАІ і судовымі выканаўцамі аплаціць штраф праз мабільнае тэрмінальнае абсталяванне, з якім работнікі ўпраўлення прымусовага выканання выязджаюць на спагнанне.

— Падчас такіх мерапрыемстваў сапраўды выяўляюцца асобы, якія вінаваты па выканаўчых вядзеннях, — адзначыў **Уладзіслаў ТРЫКОЗА, начальнік упраўлення прымусовага выканання галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама.** — Калі даўжнікі не плацяць непасрэдна на месцы, ім нагадваюць пра абавязак прыйсці ў органы прымусовага выканання для аплаты штрафу. У выпадку нез'яўлення без паважлівай прычыны ім могуць налічыць адміністрацыйнае спагнанне аж да 30 базавых велічынь.

Мер уздзеяння на даўжнікоў цэлая шмат. Абмежаванне ў карыстанні сотавай сувяззю, інтэрнэтам, кіраваннем аўто, упраўе на паляванне. Калі чалавек мае запазычанасць, яго нават могуць не выпусціць за мяжу. Канкрэтная мера залежыць не толькі ад судовага выканаўцы, а і ад гатоўнасці самога даўжніка пагашаць запазычанасць.

Адна з самых дзейсных мер — абмежаванне чалавека ў спецыяльных правах: пазбаўленне магчымасці выехаць за мяжу і кіраваць аўтамабілем. Такія рашэнні прымаюцца толькі судом па прадстаўленні судовым выканаўцам адпаведных дакументаў.

— Калі відаць, што даўжнік працягвае ўхіляцца ад выплат, нягледзячы на прынятыя судовым выканаўцам меры, абмежаваць яго ў праве выезду за мяжу могуць незалежна ад сумы доўгу, нават калі яна зусім невялікая, літаральна штраф за безбілетны праезд, — дадаў Юліян Місюкевіч.

Як бачым, падыход у рэйдах сур'ёзны, а жарты з даўгамі — справа небяспечная.

**Ірына СІДАРОК.**

*sidarok@zviazda.by*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дакументы кіроўцаў і даныя транспартных сродкаў адразу ж трапляюць да кампетэнтных правяраючых. Некалькі хвілін патрабуецца на ўвод у электронную базу запыту і атрыманне дакладнага адказу.

# Ёлка павышанай рызыкі



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Істотна распаўсюджаны і ёлкі штучныя. Яны пазбаўлены хібаў натуральных дрэў, але, на жаль, маюць і свае. Напрыклад, натуральнае дрэва згарае за 30—40 секундаў. Вільготнае дрэва супраціўляецца агню даўжэй, таму пажадана ўвільгатняць ёлку. Калі яна стаіць у кадцы з пяском, туды можна перыядычна даліваць вады. Але ж будзьце асцярожнымі з электрагірляндамі, якімі карыстаецеся пры гэтым. Штучныя прыгажуні згараюць вокамгненна — максімум за 15 секундаў. Пры гэтым ёсць вялікая рызыка выдзялення ў паветра процьмы шкодных рэчываў. Таму перад набыццём такога дрэва лепш упэўніцца, што ў прадаўца ёсць сертыфікат на яго.

— Пластмаса плавіцца, і сінтэтыка разліваецца па паверхні, таму тушыць вадой штучнае дрэва не эфектыўна. Што рабіць, калі яно загарэлася? Па-першае, адключыце гірлянды, паваліце дрэва на падлогу і накрыйце шчыльнай тканінай. Але памятайце, што калі вы не справіцеся з гэтым літаральна ў першую хвіліну — пакідайце памяшканне і тэрмінова набірайце нумар 101. Сінтэтыка выдзяляе моцныя атрутныя рэчывы, магчыма ўгарэць.

## З-за чаго можа загарэцца дрэва?

Крыніцай узгарання можа стаць звычайная электрычная гірлянда. Яе трэба набываць у афіцыйных пунктах продажу, дзе абавязкова будуць усе неабходныя сертыфікаты. Гірлянда мусіць быць абавязкова заводскай вытворчасці, а яе ізаляцыя — шчыльнай, гнуткай і без знешніх пашкоджанняў, лямпачкі — закрытымі. Скрынка пераключальніка рэжымаў не павінна лёгка прагінацца. Работу гірлянды трэба праверыць загадзя перад тым, як яе вешаць, звярнуўшы асаблівую ўвагу на праблемныя месцы: злучэнне дрота з адаптарам, пераключальнікам рэжымаў, з лямпачкамі. Дзецям даваць гірлянду адназначна не варта.

Хоць гірлянда на ёлцы прыгожа зіхаціць у цёмны час сутак, катэгарычна забараняецца пакідаць яе без нагляду на ноч. Як правіла, на сертыфікаваных гірляндах у пашпарце прапісана, колькі гадзін яна можа працаваць без перапынку. Напрыклад, у той, якой карыстаецца аўтар гэтых радкоў, прапісана: пасля 6 гадзін работы павінна наступаць 18 гадзін перапынку.

Ну і, вядома, не трэба грувасціць на ёлку з уключанай электрычнай гірляндай тое, што можа загарэцца, — цацкі з лёгкіх на загаранне матэрыялаў, абкладваць яе ватай, ставіць побач падсвечнікі са свечкамі. Любы неасцярожны рух можа прывесці да пажару.

## Найлепшае месца — у куце

Лясная прыгажуня можа важыць пару-тройку дзясяткаў кілаграмаў, а вось перакуліць яе вельмі лёгка як малому, так і хатняму гадаванцу. Таму для масіўных дрэў лепш або набыць спецыяльную крыжавіну, або проста паставіць яго ў вядро з пяском. Вельмі важна перад тым, як адпраўляцца на кірмаш, ведаць максімальна дапушчальныя габарыты дрэва. Галінкі і верхавіна не павінны датыкацца да столі, сцен, мэблі. Таксама не трэба ставіць ёлку ля ацяпляльных прыбораў: з-за гэтага дрэва толькі хутчэй высахне. І не забывайце вымятаць хвою, якая будзе абсыпацца з натуральнага дрэва.

— Варта перад набыццём разлічыць адлегласць і да дзіцячага ложка — уначы аб'ёмны сілуэт дрэва можа спалохаць малога, — кажа Алена Дзмітрук. — Таму самае ўдалае месца для ёлкі — гэта максімальна аддалены ад праходу куток, дзе на падлозе не ляжыць дыван. Там яна не будзе нікому перашкаджаць. Нават калі ёлку выпадкова закрануць падчас дзіцячай гульні, яна не ўпадзе і нікому не прынясе шкоды.

Як бачым, асноўныя правілы бяспекі на навагодніх святах не такія і складаныя для выканання. Галоўнае — прыкласці невялічкія намаганні, і тады доўгачаканыя дні не азмрочаць непрыемныя сітуацыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*schklennik@zviazda.by*

## Глядзім, што ядзім

# Духмяны батон



**Нарэзаны батон настолькі папулярны, што ёсць у асартыменце практычна любога вытворцы хлеба. Але як выбраць самы-самы? На што звяртаць увагу?**

**Батон вырабляецца з пшанічнай мукі найвышэйшага або першага гатунку з дабаўленнем цукру і тлушчу. Праўда, калі батон выраблены не паводле ДАСТу, а паводле ТУ (тэхнічных умоў), то рэцэптура і вонкавы выгляд могуць быць і іншымі.**

**Вось што будзе важным для нас як для спажыўцоў:**

— вонкавы выгляд і здольнасць батона хутка аднаўляць форму пасля лёгкага сціскання (гэта здольнасць залежыць ад вартасцяў клейкавіны мукі);

— цэлая ўпакоўка і наяўнасць у ёй кандэнсату;

— склад, абазначаны на этыкетцы;

— дата вырабу і тэрмін годнасці;

— вытворца.

Правільны батон мае прадаўгаватую авальную форму і роўныя надрэзы, ніякага распаўзання і трэшчын. Колер — ад светла-залацістага да светла-карычневага, што залежыць ад рэцэптуры. Калі ў хлебе больш здобы (цукру і тлушчу), то скарыначка больш карычневая. Калі здобы няма, то больш светлая. На колер можа ўплываць і час выпечкі. Калі батон не быў вытрыманы да моманту гатоўнасці, або выпякаўся пры няправільнай тэмпературы, то залацістай скарыначкі не атрымаецца. Аднак на прадпрыемствах рэжым гатавання настолькі адпрацаваны, што такога не адбываецца.

Простая рэцэптура прадугледжвае наяўнасць толькі асноўнай сыравіны — мукі, вады, солі і дражджэй. Аднак могуць дадавацца і іншыя інгрэдыенты: цукар, масла. Прычым цукру павінна быць не больш за 4 працэнты, а масла або маргарыну — у межах 3 працэнтаў.

Якасны батон не павінен крышыцца падчас наразання, але ці можна гэта прадбачыць да таго, як патраціў грошы? У ідэале падчас вырошчвання пшаніцы неабходна абавязкова выкарыстоўваць азотныя ўгнаенні. Але зараз гэтага часта не робяць, таму што на гэтым можна сэканоміць. Аднак калі не ўносіць азотныя ўгнаенні, то гэта ўплывае на колькасць бялку (клейкавіны). Калі яго мала, значыць, хлеб моцна крышыцца.

У муцэ пшанічнай хлебапякарнай найвышэйшага гатунку колькасць клейкавіны павінна быць не меншай за 28 працэнтаў, калі першага гатунку, то 30. Аднак лічыцца, што для мучных кандытарскіх вырабаў дастаткова і 22—25 працэнтаў.

Словам, калі вы бачыце на этыкетцы «мука хлебапякарная пшанічная найвышэйшага гатунку», то хлеб не павінен крышыцца, а калі ўзялі з «мукой агульнага прызначэння», то могуць быць нюансы.

Што да ўпакоўкі, то гэта можа быць поліэтылен, папяровы пакет або герметычны. Апошні дазваляе даўжэй абараняць хлеб ад цвілі. У гэтым выпадку яго астуджаюць, упакоўваюць у ламінаваную плёнку і зноў заганяюць у печ, награваючы да 70 градусаў, што на 26—28 градусаў ніжэй, чым падчас выпечкі. Гэты працэс называецца «пастэрызацыяй хлеба», аб чым на ўпакоўцы павінен быць адпаведны надпіс. У герметычнай упакоўцы вырабы могуць захоўвацца... і месяц!

У продаж у асноўным паступаюць батоны, упакаваныя ў поліэтыленавыя пакеты або наогул без упакоўкі. Тэрмін прыдатнасці можа складаць да 3 сутак (на прылаўку не можа знаходзіцца батон тыднёвай даўніны!), а без упакоўкі — 24 гадзіны.

Маркіроўка батонаў, як і любой харчовай прадукцыі, павінна змяшчаць пералік інгрэдыентаў у парадку ўбывання, харчовую каштоўнасць, дату вырабу, тэрмін прыдатнасці, назву вытворцы, масу вырабу.

Часам можна назіраць ва ўпакоўцы кандэнсат. Ён з'яўляецца, калі пасля выпечкі батон недастаткова ахаладзілі і адразу ўпакавалі. Павышаная колькасць вільгаці можа скарачаць тэрмін захоўвання і правакаваць хуткае з'яўленне цвілі.

**Белы хлеб можа не толькі пакрыцца цвіллю — «захварэць». Гэта азначае, што ў ім з'явіліся мікатаксіны — ядавітыя рэчывы, якія валодаюць канцэрагенным дзеяннем. Падсмажванне, падсушванне, зразанне цвілі не робяць хлеб небяспечным!**

Другая праблема — парушэнне мікрабіялогіі. Размова ідзе пра мікраарганізмы Bacillus Subtilis (сенная палачка) і Bacillus mesentericus (бульбяная палачка). Самі яны хутка гінуць падчас выпякання, а вось іх споры больш тэрмаўстойлівыя. Калі батон выраблены з заражанай бульбяной палачкай мукі, то пры павышанай вільготнасці і тэмпературы праз некалькі дзён у хлебе з'явяцца прыкметы «бульбяной хваробы». Мякіш пацямнее, стане ліпкім і будзе непрыемна пахнуць. Такі хлеб ужываць таксама нельга.

**Першыя прыкметы ўсіх хлебных хвароб праяўляюцца мінімум праз суткі пасля вырабу. Калі штосьці не так, прадукт трэба выкінуць.**

Заводскія батоны і батоны з пякарняў у супермаркетах маюць адрозненні.

Вытворчасць батонаў ва ўмовах міні-пякарні часта ажыццяўляецца па паскоранай тэхналогіі. Гэта лёгка вылічыць па пышным аб'ёме і «ватным» мякішы. На хлебазаводах арганізаваны жорсткі кантроль за якасцю сыравіны, тэхналагічным працэсам вытворчасці і гатовай прадукцыяй. І, як правіла, менавіта тут вытрымліваюцца класічныя тэхналогіі вырабу. У склад батонаў, выраблених па стандартнай рэцэптуры і класічнай тэхналогіі, не ўваходзяць спецыяльныя дабаўкі-паляпшальнікі. Вырабы, прыгатаваныя класічнымі працяглымі спосабамі, маюць больш яркі смак і водар. Аднак пра густы не спрачаюцца...

## Непрыемны сімптом

# АД КАШЛЮ ЦІ ДЛЯ КАШЛЮ?



**Гэта абарончая рэакцыя нашага арганізма дапамагае ачысціць дыхальныя шляхі ад усяго, што ў іх назапашваецца. Кашаль — спадарожнік вялікай колькасці захворванняў.**

Можа правакаваць ваніты, змяненне тэмбру голасу, парушаць сон, пагаршаць стан. Кашаль, безумоўна, не самастойнае захворванне, а важны сімптом. Як правіла, інфекцый дыхальных шляхоў. Запаленне можа быць як у верхніх (нос, насаглотка, ратаглотка), так і ў ніжніх дыхальных шляхах (гартань, трахея, бронхі, лёгкія). Другой прычынай кашлю ў дзяцей можа стаць запаленне ЛОР-органаў — рыніты, фарынгіты, сінусіты, адэноідыты, ларынгіты. Кашаль з'яўляецца і адной з найбольш важных клінічных прыкмет бранхіяльнай астмы. Прычынай можа стаць высокая канцэнтрацыя шкодных рэчываў у паветры (загазаванасць, тытунёвы дым), а таксама вельмі сухое і перагрэтае паветра ў пакоі.

— Па характары кашаль дзеляць на вільготны, калі ён з макротай, і сухі, калі ніякіх выдзяленняў няма, — тлумачыць **урач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.** — Сухі, гучны, адрывісты кашаль узнікае пры запаленні гартані, трахеіце. Праз некалькі дзён кашаль пераходзіць ад сухога да вільготнага, падаўляць які не варта. Лекі павінны быць не ад, а для кашлю.

Калі кашаль хваравіты, пакутны, зняць сухасць слізістых павінны дапамагчы інгаляцыі (парайцеся з урачом наконт набыцця небулайзера). Макрота будзе адыходзіць лягчэй, калі ўжываць дастатковую колькасць вадкасці — чаю, морсу, адвару шыпшыны або нават проста чыстай вады.

Зрабіць кашаль больш вадкім дапамогуць зборы траў. Напрыклад, такі: корань алтэі — 1 г, корань салодкі голай — 0,5, фіялка трохколерная — 0,5, лісце падбелу — 0,6, кветкі дзіванны — 0,5, плады анісу — 0,5, лісце ісопу лекавага — 1, плады шыпшыны — 10, плады глогу — 10.

1—2 ст. л. збору заліваюць 200 мл гарачай вады, накрываюць і 15 хвілін трымаюць на вадзяной лазні. Затым працэджваюць і ўжываюць па 1/2—1/3 шклянкі 3—4 разы ў дзень у цёплым выглядзе.

Карысны таксама і спецыяльны масаж груднай клеткі.

## Псіхалогія для ўсіх

# НЯМА СІЛ ПРАЦАВАЦЬ...

**Эмацыянальнае выгаранне — гэта наша псіхалагічная абарона, калі стрэсы на працы пачынаюць нас знясільваць.**

**Шаг аукциона – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 декабря 2017г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 8 января 2018 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) **не позднее 20 (двадцати) рабочих дней** с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем (единственным участником) аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Департаментом по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 (двадцать) рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по оплате предмета торгов. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства (Указ Президента РБ от 19.02.2016 г. №63). **Примечание: земельный участок под объект продажи будет сформирован согласно законодательству РБ покупателем после приобретения капитального строения самостоятельно. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

---

Утерянные бланки страхового полиса формы 2РН, 2РП Серия ББ 0335701 от 06.10.2017, принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительными**.

УНП 101063229

---

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
### по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова. Жилой дом №12 по генплану», опубликованную в газете «Звязда» №200 (28564) от 17.10.2017.

**Условия оплаты по договорам создания объекта долевого строительства** – ежемесячно на основании представленных застройщиком справок о стоимости выполненных работ, затратах застройщика и размере очередного взноса для оплаты стоимости строительства жилого помещения.

УНП 192400611

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона цены по продаже имущества, принадлежащего УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома

| № Лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | 1. Машина холодильная фреоновая ХМ ФУУ-80 IРЭ с инв. №0102906/1; 2. Машина холодильная фреоновая ХМ ФУУ-80 IРЭ с инв. №0102906/2; 3. Машина холодильная фреоновая ХМ ФУУ-80 IРЭ с инв. №0102906/3. В состав холодильной машины входят: агрегат компрессорно-конденсаторный в комплекте с системой автоматического управления и электродвигателем 55 кВт/1500 об/мин, агрегат испарительно-регулирующий. Оборудование не эксплуатировалось более 20 лет, требует некоторого ремонта или замены отдельных частей | 28 183,36 | 2 000,00 |
| Лот №2 | Автомобиль ГАЗ-САЗ 3507 кузов (рама) №44547, 1991 г. в. Тип ТС – грузовой авт. Особые отметки – самосвал. Двигатель – дизельный. Отсутствует стартер, АКБ, требуется ремонт тормозной и гидравлической систем, не эксплуатируется с 2010 года. Пробег по одометру на 17.11.2010 – 00937 км | 1 634,78 | 160,00 |
| Лот №3 | 1. Гараж металлический с инв. №0100452. 2. Гараж металлический с инв. №0100453. Размер 6х3 м, требуется покраска | 68,88 | 10,00 |
| Лот №4 | Сборно-разборный склад с инв. №0100584. Каркас склада – профильный металл, обшивка – листовой металл, шиферная кровля, размер склада 9,2х8,2х4,5 м | 3 350,70 | 350,00 |
| Лот №5 | 1. Станок деревообрабатывающий ТАИФ-042231 с инв. №0100827. Требует некоторого ремонта или замены отдельных частей. 2. Компрессор с инв. №0100896, 1990 г. в. | 271,38 | 40,00 |
| Лот №6 | Автомобиль ГАЗ 3110 101 кузов (рама) №ХТН31100010453178, 2001 г. в. Тип ТС – легковой специальный седан. Особые отметки – фото-, кино-видеообслуживание. Двигатель – бензин, 2280 куб. см. Требует ремонта, возможно замены отдельных частей. Пробег по одометру на 01.12.2017 – 143292 км | 1 154,27 | 120,00 |
| Лот №7 | Автомобиль УАЗ 3151 9-017-10 кузов (рама) №31514020012057/31510020125179, 2002 г. в. Тип ТС – легковой специальный джип. Двигатель – бензин, 2890 куб. см. Требуется ремонт двигателя, кузовные работы. Пробег по одометру на 01.12.2017 – 87897 км | 934,02 | 100,00 |
| Лот №8 | Трансформаторная подстанция КТПТАС-К/ВК-400/10/0.4. Не используется с 2009 года, требуется покраска. | 7 924,97 | 600,00 |

**Местонахождение Лотов**: лот №1 – г. Минск, пр-т Независимости, 73; лоты №№2, 3, 4, 5, 8 – г. Минск, ул. Папанина, 9; лоты №№6, 7 – г. Минск, ул. Красноармейская, 26

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.

Срок оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов): не более 10 (десяти) календарных дней после заключения договора купли-продажи.

Вывоз объектов (лота №№2, 5, 6, 7, 8) и демонтаж и вывоз объектов (лота №№ 1, 3, 4) производит Победитель аукциона (Претендент на покупку) за свой счет.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 23.01.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец**: УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома, 220030, г. Минск, ул. Красноармейская, 26, тел. 8 (017) 223-37-34.

**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11 пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома, проводимом 23 января 2018 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 19.01.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кореник Андрей Сигизмундович, тел.: 8(017) 327-07-06, 8 (029) 619-73-54.

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# «ПЕРАМОГ ВАМ, МУЖЫКІ!»

## Маладзёжная зборная (U-20) па хакеі адпраўляецца на чэмпіянат свету ў элітным дывізіёне

**Турнір пройдзе ў амерыканскім Бафала з 26 снежня па 5 студзеня. Першы этап падрыхтоўкі каманда правяла ў мінскім Палацы спорту, трэніроўкі на лёдзе чаргаваліся з заняткамі па фізічнай падрыхтоўцы. 16 снежня «маладзёжка» адправілася ў амерыканскі Эры (штат Пенсільванія), дзе напярэдадні старту чэмпіянату свету правядзе тры спарынгі (наша каманда ўжо атрымала адну перамогу). Старшыня Федэрацыі хакея Сямён ШАПІРА пажадаў хакеістам добрага выступлення і поспехаў.**



*— Вы адпраўляецеся абараняць гонар нашай Радзімы. А што такое Радзіма? У першую чаргу — гэта тата і мама, брат, сястра, гэта сябры і суседзі, гэта наш дзесяцімільённы народ, гэта наша зямля, прасякнутая крывёй бацькоў і дзядоў. Беларусы заўсёды славіліся сілай свайго характару. У гісторыі нашай краіны было нямала войнаў. На шчасце, сёння мы жывём у мірны час. Аднак зусім хутка вас чакае хакейная бітва, якую вы павінны прайсці годна. Вы будзеце прадстаўляць Беларусь усяму свету. Па гульні, якую вы прадэманструеце, будуць судзіць пра нашу краіну, пра сілу духу, пра характар беларусаў. Мы ўсе будзем вас падтрымліваць. Я шчыра хачу пажадаць вам добрай спартыўнай кар'еры.*

*Думаю, што мінуць гады і з вас вырастуць сапраўдныя хакейныя зоркі. Хай турнір пройдзе без траўмаў. Здароўя і ўдачы вам. Сёння вы прадстаўляеце Беларусь у эліце сусветнага маладзёжнага хакея. Гэта найвышэйшая адказнасць і гонар. За вамі будучыня. Перамог вам, мужыкі!*

Галоўны трэнер зборнай U-20 Юрый Файкоў адзначыў, што галоўнай задачай з'яўляецца захаванне месца ў эліце маладзёжнага хакея.

Сапернікамі беларускай каманды па групе «В» на папярэдняй стадыі маладзёжнага чэмпіянату свету стануць аднагодкі са Швецыі (26 снежня), Швейцарыі (27 снежня), Расіі (29 снежня) і Чэхіі (30 снежня).

У групе «А» зведзены зборныя ЗША, Канады, Даніі, Славакіі і Фінляндыі.

Адзначым, па чатыры найлепшыя каманды кожнай групы выйдуць у чвэрцьфінал, аўтсайдары ў серыі да дзвюх перамог будуць змагацца за захаванне праціскі ў элітным дывізіёне.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*



hockey.by

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.26 | 16.49 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.23 | 16.31 | 7.08 |
| Магілёў — | 9.16 | 16.39 | 7.23 |
| Гомель — | 9.04 | 16.44 | 7.40 |
| Гродна — | 9.40 | 17.05 | 7.25 |
| Брэст — | 9.32 | 17.15 | 7.43 |

## Месяц

*Маладзік 18 снежня. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр.* Антона, Івана, Міхаіла, Нікіфара, Ніла, Паўла, Сяргея.
*К.* Дамініка, Ігната, Яўгена.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## 50+: жыць цікава

# «Ад крыўдаў і нягод уцякаю да вершаў...»

**У сталічным Палацы культуры ветэранаў прайшоў творчы вечар паэтэсы Лізаветы Палеес.**

Лізавета Палеес — паэт, перакладчык, філолаг, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Яе вершы добра вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і ў Расіі, Казахстане, Украіне, Германіі. Выдатны рускі паэт Веніямін Блажэнны так напісаў пра яе творчасць: «Вершы Лізаветы Палеес перш за ўсё эмацыянальныя, а гэта — асноватворная ўласцівасць сапраўднай паэзіі». Уся панарама любоўных пачуццяў, усе таямніцы жаночай душы перад намі агаленыя шчатліва і бясстрашна, як у геніяльнай паэзіі Ахматавай. Часам пачуцці дасягаюць сапраўдных вышынь самай чыстай паэзіі»...

Нягледзячы на сур'ёзны лічбы ўзросту (паэтэсе нядаўна споўнілася 70), яна застаецца на здзіўленне маладой душой, сведчанне чаму — яе цыклы вершаў пра каханне.

Арганізаваў творчы вечар паэтэсы сталічны Клуб здароўя і культуры «Маэстра».

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## Здарэнне

# Тараніў патрульнае аўто

**У Мінску п'яны кіроўца-бясспраўнік у двары дома ўрэзаўся ў машыну ДАІ, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

Інцыдэнт адбыўся раніцай. У Першамайскае РУУС паступіла тры паведамленні аб кіроўцы Citroen Xantia, які ехаў па вуліцы Русіянава і неадэкватна сябе паводзіў. Экіпаж ДПС, што знаходзіўся непадалёку, выбыў на месца і каля аднаго з дамоў заўважыў названы аўтамабіль, які павярнуў направа ў арку дома і спыніўся. Інспектар на машыне прытармазіў за ім, блакуючы выезд. Раптам кіроўца паехаў заднім ходам і ўрэзаўся ў патрульны аўтамабіль.

Вадзіцеля затрымалі, па выніках медыцынскага агляду ў яго крыві выявілена два праміле алкаголю. Як высветлілася, мужчына быў пазбаўлены вадзіцельскіх правоў у 2011 годзе за язду ў нецвярозым стане, пасля чаго іспыты ў ДАІ не пераздаваў і вадзіцельскае пасведчанне не забіраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 20 СНЕЖНЯ

**1802** год — нарадзіўся (в. Вялікія Сяхновічы, цяпер у Жабінкаўскім раёне) Ігнацій Жялязоўскі, праваслаўны рэлігійны дзеяч. Скончыў Галоўную семінарыю пры Віленскім універсітэце. У 1836—1839 гадах быў інспектарам Літоўскай семінарыі. У часе полацкага царкоўнага сабора (1839) падпісаў сярод іншых святароў «Саборны акт аб уз'яднанні» ўніяцкай царквы з праваслаўнай. У 1839—1848 гадах быў настаяцелем Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне, клапаціўся аб захаванні гэтага помніка архітэктуры. Пасля паўстання 1863—1864 гадоў садзейнічаў закрыццю каталіцкіх касцёлаў. У апошнія гады жыцця займаўся мецэнацтвам, збіраў бібліятэку. Памёр у 1872 годзе. З 1875 года ў Віленскім духоўным вучылішчы была ўстаноўлена стыпендыя епіскапа Ігнація для дзяцей-сірот, якія паказвалі выдатныя здольнасці ў авалоданні навукамі.

**1917** год — 100 гадоў таму ўтворана Усерасійская надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам (ВЧК) на чале з Ф. Э. Дзяржынскім.

**1932** год — прынята пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб абвяшчэнні Беларускай ССР краінай суцэльнай пісьменнасці».

**2000** год — палата лордаў Вялікабрытаніі адобрыла ўрадавы законапраект, які дазваляў выкарыстоўваць кланіраваныя эмбрыёны чалавека ў медыцынскіх мэтах. Такім чынам, Вялікабрытанія стала першай у свеце краінай, дзе было легалізавана кланіраванне эмбрыёна чалавека. Клеткі эмбрыёнаў павінны выкарыстоўвацца для барацьбы з цяжкімі захворваннямі: раку, лейкеміі і хваробы Паркінсана.



### Было сказана

**Уладзімір ЖЫЛКА, паэт:**

*«Хто мужны, хто смелы, хто дужы,*
*Хто цэлем працят залатым,*
*Над тым неўладарныя сцюжы,*
*І лёс неўладарны над тым».*

## УСМІХНЕМСЯ

Дыктар на экране тэлевізара:

— А цяпер, дарагія жанчыны, мы на пяць хвілін перарываем паказ серыяла, каб вы знялі з пліты падгарэлы абед...

**Ніколі не пачынайце істэрыку, лежачы на спіне. Слёзы зацякаюць у вушы, і становішча робіцца казытна і смешна.**

**Я так ужо тры істэрыкі сарвала.**

— Прыкінь, я пакуль у метро ехала, пахудзела на 133 грамы.

— Адкуль такая дакладнасць?

— Тэлефон сперлі...

**Засвярбеў нос. Печань здрыганулася.**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4789.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2017 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

20 снежня 2017 г. №48 (432)




стар. 3

**Пасажыр плаціць двойчы?**



стар. 4

**Уцяпленне дома — за кошт жыльцоў**



стар. 7

**З ветрыкам па гравійцы**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ПА КІМ ПЛАЧА КАПРАМОНТ?

## Карэспандэнт «МС» высвятляла асаблівасці капітальных рамонтаў на прыкладзе Магілёўскай вобласці



Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.

**Па статыстыцы звароты са скаргамі на стан жылля ад насельніцтва ў органы дзяржаўнай улады займаюць адно з першых месцаў. І адзін са спосабаў папярэдзіць іх — той жа капрамонт. Спецыялісты падлічылі: каб падтрымліваць жыллёвы фонд у нармальным стане, трэба штогод капітальна рамантаваць не менш чым 3% ад яго агульнага аб'ёму. Наколькі гэта задача выканальная?**

### Клічаўскі рэкорд

Капітальныя рамонты, як вядома, вядуцца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў і адлічэнняў грамадзян. Напрыклад, на 2017 год Магілёўская вобласць планавала выдаткаваць на гэтыя мэты каля 36 мільёнаў рублёў: сёлета трэба было адрамантаваць 295 тысяч квадратных метраў жылля, або 137 дамоў. За 10 месяцаў адрамантавана 202,7 тысячы «квадратаў» (97 дамоў).

Клічаву, напрыклад, пашчасціла зрабіць капрамонт аж 18 шматкватэрных дамоў ( 24 тысячы квадратных метраў жылля). Лічба рэкордная, асабліва калі параўнаць з тым, што кожны год тут рамантуецца ў сярэднім 3—4 дамы. Паскорыць працэс дапамог абласны фестываль працаўнікоў сяла «Дажынкі». Пад гэтую марку раёну выдзелілі на капрамонты грошай як ніколі — 2 мільёны 200 тысяч рублёў. Плюс 140 тысяч рублёў склалі адлічэнні грамадзян. «Звычайна ж бюджэтных грошай выдзяляецца ў 2,5—3 разы больш, чым збіраецца ад насельніцтва, — удакладняе **дырэктар Клічаўскага УКП «Жылкамгас» Андрэй МАЦЮШОНАК**. — Сёлета мы адчувальна палепшылі становішча жыллёвага фонду ў горадзе. Але праблем усё яшчэ хапае, асабліва ў раёнах».

Двойчы ў год вясной і восенню камунальнікі праводзяць абследаванні жыллёвага кватэрнага фонду. Па іх выніках складаюцца дэфектныя акты. Пры ўнясенні дома ў спіс на капрамонт улічваецца, у якім годзе ён пабудаваны, ці быў ужо на капрамонце цалкам або часткова і гэтак далей.

Скаргі жыхароў таксама ўлічваюцца, але яны не з'яўляюцца асноватворнымі, калі вынікі абследаванняў не супадаюць з тым, аб чым сігналізуе заяўнік. Часцей за ўсё пры праверцы высвятляецца, што праблема лакальная і абысціся можна бягучым рамонтам.

стар. 5

КУЛЬТУРНЫ ЗРЭЗ

# БІБЛІЯТЭКА ПАЙШЛА «Ў НАРОД»

**Цяпер вядзецца шмат спрэчак наконт таго, ці патрэбны бібліятэкі на вёсках. Навошта, маўляў, «папяровая» літаратура, калі ёсць інтэрнэт, гаджэты, электронныя кнігі? Аднак прыхільнікі такога пункту гледжання забываюць, што далёка не ўсім вяскоўцам даступныя сучасныя тэхналогіі. Акрамя таго, у малазабяспечаных грамадзян, пенсіянераў часам няма матэрыяльнай магчымасці выпісаць новыя перыядычныя выданні, таму яны актыўна карыстаюцца паслугамі грамадскіх бібліятэк. Разам з тым для вяскоўцаў бібліятэка — гэта цэнтр зносін, дзе можна сустрэцца і абмеркаваць мясцовыя навіны, цэнтр культуры, адпачынку, выхавання. І там, дзе працуюць творча, з фантазіяй, жывінкай, установы ніколі не пустуюць. У гэтым упэўнілася карэспандэнт, пабываўшы ў Цімкавіцкай сельскай бібліятэцы Капыльскага раёна.**

— Наша бібліятэка самая буйная сярод сельскіх у раёне. Яе фонд налічвае больш за 12 тысяч экзэмпляраў друкаванай прадукцыі, у тым ліку восем найменняў часопісаў і 14 газет, — кажа **загадчыца Вольга РАДКЕВІЧ**. — Мы абслугоўваем чатырнаццаць вёсак. Паслугамі бібліятэкі карыстаецца больш за тысячу чытачоў. Акрамя таго, у нас ёсць і бібліятэка-спадарожнік у вёсцы Лешня Блеўчыцкага сельсавета.

У бібліятэцы працуюць па некалькіх мэтавых праграмах. Але, як лічыць Вольга Уладзіміраўна, асноўная з іх — краязнаўчая. Бо чалавек, які ведае гісторыю роднага краю, свае карані, мае будучыню. А Цімкавіцкая зямля багатая на таленты. Тут нарадзіўся будучы прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Вайтовіч, вядомы моваазнаўца Алесь Бельскі, яго дзядзька Фама Антонавіч — прафесар — былы выкладчыкам Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта. Ну і каму не вядомыя імёны пісьменніка Кузьмы Чорнага, грамадскага дзеяча, мецэната Эдварда Вайніловіча?

стар. 6




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Загадвае бібліятэкай Вольга РАДКЕВІЧ.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## УСТАЛІ НА ПРАВІЛЬНЫЯ РЭЙКІ

*Міхаіл Мясніковіч павіншаваў Беларускую чыгунку са 155-годдзем*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч прыняў удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным юбілею Беларускай чыгункі. Свята адбылося ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Старшыня Савета Рэспублікі ўручыў работнікам БЧ ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Беларусі.**

У сваім выступе Міхаіл Мясніковіч павіншаваў Беларускую чыгунку з юбілеем, а таксама звярнуў увагу на яе значнасць для эканомікі Беларусі. Далейшая пасяховая праца арганізацыі не падвяргаецца сумненню, упэўнены ён.

— Перакананы, што, адкрываючы новую старонку сваёй гісторыі, Беларуская чыгунка ўнясе значны ўклад у рэалізацыю ініцыятывы па спалучэнні Еўразійскага эканамічнага саюза і эканамічнага пояса Шаўковага шляху, забяспечыць шырокае ўкараненне інавацыйных тэхналогій, а таксама будзе садзейнічаць развіццю інтэграцыйных працэсаў, якія з'яўляюцца залогам стабільнасці і росквіту нашай дзяржавы, — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

## ВЫВЕСЦІ НА ЧЫСТУЮ ВАДУ

*Праблемныя пытанні пітнога водазабеспячэння абмеркавалі на спецыяльнай нарадзе*

**На мінулым тыдні ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова адбылася рабочая сустрэча, прысвечаная пытанням пітной вады ў цэлым і падрыхтоўцы праекта Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы па пытаннях пітнога водазабеспячэння» ў прыватнасці.**

Удзельнікі нарады, сярод якіх былі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Юрый Дарагакупец, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр Церахаў, намеснік галоўнага ўрача ДУ «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя» Анжэла Скурановіч і іншыя, абмеркавалі аспекты забеспячэння насельніцтва пітной вадой.

На нарадзе было адзначана, што ў законапраект трэба дадаць нормы, якія рэгулююць фінансаванне расходаў па развіцці сістэм пітнога водазабеспячэння. Акрамя таго, неабходна правядзенне навукова-даследчых работ па паляпшэнні такіх сістэм. Удзельнікі прапанавалі дадаць у законапраект пераходныя палажэнні ў сувязі з неабходнасцю інвентарызацыі цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння, а таксама фарміравання фондаў для іх будаўніцтва, рамонту і эксплуатацыі. Акрамя таго, абмяркоўвалася пытанне інвеставання ў развіццё сферы.

## ЗАРАБІЛІ — ПАКІНЬЦЕ САБЕ

*Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі прыняў удзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах*

**На сустрэчы разглядаліся законапраекты «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2018 год», «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2018 год» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Беларусь».**

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў расказаў, што праектам бюджэту на наступны год прадугледжаны механізмы для стымулявання прыцягнення мясцовымі бюджэтамі дадатковых сродкаў без памяншэння памеру міжбюджэтных трансфертаў.

— Мы сёння павінны разам падахвочваць і работнікаў, і бізнес-супольнасць зрабіць усё магчымае, каб павялічыць прыбытковую частку бюджэту, — падкрэсліў Уладзімір Панцюхоў. — Задача ў тым, каб мясцовыя бюджэты самі змаглі зарабляць і не чакалі датацый з рэспубліканскага бюджэту. І мы павінны гэтую ініцыятыву заахвочваць, стымуляваць, каб яны разумелі, што любы дадатковы зароблены рубель застанецца там — у галіне, раёне, горадзе.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# Рухацца да мэт

**Учора ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі адбыліся адкрытыя парламенцкія слуханні на тэму «Партнёрства галін улады як неабходная ўмова паспяховага дасягнення Мэт устойлівага развіцця».**

У слуханнях узялі ўдзел сенатары і дэпутаты, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, члены Савета па ўстойлівым развіцці, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, грамадскіх арганізацый.

«Беларусь гатова садзейнічаць умацаванню глабальнага партнёрства для дасягнення Мэт устойлівага развіцця і можа стаць платформай для рэгіянальнага абмену адпаведнымі вопытам, ведамі, тэхналогіямі, — падкрэсліў **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Задачы ў нас агульныя — павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця краіны».

*(Больш падрабязна пра гэта чытайце ў наступным нумары «Мясцовага самакіравання»).*

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

# ІДЗЁМ НА ЗБЛІЖЭННЕ

## Саюзная дзяржава гарантуе роўныя правы

**У мінулыя выхадныя ў Бранску адбыліся парламенцкія слуханні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, на якіх дэпутаты абмеркавалі праблемы збліжэння заканадаўстваў абедзвюх краін у забеспячэнні роўных правоў грамадзян Саюзнай дзяржавы.**



Занятасць насельніцтва і фарміраванне агульнага рынку працы, прадпрымальніцкая дзейнасць, пенсійнае забеспячэнне, ахова здароўя і маладзёжная палітыка — усе гэтыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі дэпутатаў Саюзнага парламента. Чарговае пасяджэнне пяцьдзясят трэцяй сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі прайшло гэтым разам на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. У парламенцкіх слуханнях у Бранску прынялі ўдзел дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы, прадстаўнікі галіновых міністэрстваў Беларусі і Расіі, якія займаюцца пытаннямі забеспячэння роўных правоў грамадзян.

Падчас слуханняў было адзначана, што Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, прыняты ў снежні 1999 года, а таксама шэраг пагадненняў паміж урадамі Беларусі і Расіі ў цэлым даюць гарантыі роўных правоў грамадзян на тэрыторыі Расіі і Беларусі ў частцы аказання медыцынскай дапамогі, выбару месца знаходжання і жыхарства на тэрыторыях дзяржаў — удзельніц Саюзнай дзяржавы, таксама заканадаўча ўрэгуляваны пытанні аб пазбяганні падвойнага падаткаабкладання. Аднак, застаецца яшчэ нямала нявырашаных пытанняў, з якімі сутыкаюцца грамадзяне як Расіі, так і Беларусі, апынуўшыся на тэрыторыі суседняй дзяржавы. І праблемы гэтыя звязаны з рознай трактоўкай тых ці іншых пытанняў у заканадаўствах абедзвюх краін.

Так, напрыклад, з 1 студзеня 2015 года ў пенсійным заканадаўстве Расійскай Федэрацыі змяніліся патрабаванні да вызначэння права грамадзян на страхавую пенсію: павысіўся страхавы стаж з 5 да 15 гадоў, і ўведзены індывідуальны каэфіцыент (так званыя балы). Для таго, каб аб'ектыўна вызначыць права на расійскую пенсію для грамадзян, якія маюць стаж работы ў Рэспубліцы Беларусь, неабходна ўнесці некаторыя карэкціроўкі ў Дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння.

Таксама актуальнымі, на думку дэпутатаў Саюзнага парламента, з'яўляюцца і праблемы, звязаныя з рэгуляваннем заканадаўства ў сферы эканомікі і прадпрымальніцкай дзейнасці.

> Нягледзячы на тое, што да цяперашняга моманту ў рамках Саюзнай дзяржавы ўдалося сфарміраваць механізмы дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу, прадпрымальнікі па-ранейшаму сутыкаюцца з шэрагам адміністрацыйных бар'ераў пры стварэнні і рэгістрацыі прадпрыемства, а таксама пры ліцэнзаванні прадпрымальніцкай дзейнасці.

Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА,** у цэлым у сферы занятасці, працаўладкавання, адукацыі, свабоды перамяшчэння, спорту і турызму заканадаўства Беларусі і Расіі ў дастатковай меры гарманізавана і забяспечвае роўныя правы грамадзян абедзвюх краін. Застаюцца адкрытымі некаторыя асобныя пытанні, работа па якіх будзе працягнута. На думку парламентарыя, сумесная дзейнасць у рамках адзінай эканамічнай прасторы дае свае станоўчыя вынікі. Напрыклад, тавараабарот Беларусі і Расіі сёлета вырас больш чым на 20 працэнтаў, у тым ліку дзякуючы рэгіянальным сувязям, якія шырока развіваюцца. «Аднак сёння неабходна звярнуць пільную ўвагу на тое, як выконваюцца сумесныя праграмы, якія фінансуюцца з Саюзнага бюджэту. Сёлета назіраецца прафіцыт у памеры каля 2 мільярдаў расійскіх рублёў. Гэта значыць, што па шэрагу важных кірункаў інтэграцыйнага супрацоўніцтва няма своечасовага асваення сродкаў. І гэта абумоўлена фармальным падыходам некаторых чыноўнікаў да выканання нормаў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы».

Усе набалелыя праблемы саюзнага будаўніцтва, у тым ліку і ў сферы гарманізацыі заканадаўстваў абедзвюх краін, будуць абмяркоўвацца на пятым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца ў верасні наступнага года ў Магілёве. Падрыхтоўка да яго ідзе поўным ходам. Плануецца, што асноўнымі пытаннямі абмеркавання стануць перспектывы эканамічнага супрацоўніцтва рэгіёнаў абедзвюх краін на аснове развіцця IT-тэхналогій і шляхі фарміравання рэгіянальных ВУП праз сумесныя праекты па развіцці лічбавай эканомікі.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

БІЗНЕС-КЛІМАТ

# Чаму няма прытоку інвестыцый?

## Адказ на гэтае пытанне шукалі падчас круглага стала ў Савеце Рэспублікі

**У верхняй палаце парламента падчас круглага стала абмеркавалі, чаму не назіраецца росту інвестыцый у беларускія прадпрыемствы. За дзевяць месяцаў гэтага года прыцягнута $905 млн прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове пры заданні $1 млрд 30 млн.**

«Вядома, для кожнага інвестара ў любой краіне важна, каб правілы гульні на яго полі дзейнасці былі зразумелыя і простыя, а заканадаўчая база, якая рэгулюе пытанні вядзення бізнесу, — празрыстай і стабільнай», — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.** Таму адным з дзейсных механізмаў павышэння інвестыцыйнай прывабнасці краіны з'яўляецца ўдасканаленне заканадаўства.

Уладзімір Панцюхоў таксама падкрэсліў, што сёння інвестыцыйную сферу ў дзяржаве рэгулююць каля 40 прававых актаў, створана міжведамасная рабочая група для выпрацоўкі сістэмных мер па ўдасканаленні ў краіне інвестклімату. «Аднак смелых і эфектыўных навацый у інвестыцыйным заканадаўстве да гэтага часу няма, комплексныя рашэнні не прымаюцца», — дадаў ён.

Пры гэтым выгаднае геаграфічнае становішча і рост эканомікі спрыяюць прыцягненню інвестараў у Беларусь, лічыць **генеральны дырэктар кампаніі «Марка», член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Мікалай МАРТЫНАЎ.** А дадатковым стымулам для супрацоўніцтва з замежнымі кампаніямі з'яўляецца членства нашай краіны ў Еўразійскім эканамічным саюзе, дзякуючы якому для інвестараў адкрываецца рынак адразу некалькіх краін.

«Гэтай перавагай трэба больш актыўна карыстацца», — лічыць сенатар. Акрамя таго, актуальным пытаннем застаецца стварэнне больш камфортных умоў для работы беларускіх вытворцаў на рынках краін — членаў ЕАЭС, уваходжанне ў іх дзяржаўныя праграмы. «А для гэтага трэба збліжаць нашы заканадаўствы», — лічыць ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

КРУГЛЫ СТОЛ

# Тэорыя і практыка самакіравання

**Старшыня пастаяннай камісіі мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных справах Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Георгій АТАМАНАЎ падчас круглага стала ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі расказаў, хто ў сталіцы займаецца грамадскім самакіраваннем.**

Асаблівасць Мінска заключаецца ў тым, што ў амаль двухмільённым населеным пункце гарадскі Савет дэпутатаў з'яўляецца адзіным органам мясцовага самакіравання, бо ў раёнах горада аналагічных структур няма. Каб ліквідаваць такі прабел, і былі створаны Саветы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (ОТГС), кожны з якіх узначальвае адзін з дэпутатаў гарсавета, абраных у раёне. А ў кожным мікрараёне існуе калегіяльны ОТГС.

**Георгій Атаманаў гаворыць, што па папулярнасці ў насельніцтва органы мясцовага самакіравання знаходзяцца, на жаль, на апошнім месцы сярод уладных структур і прайграюць мясцовым органам кіравання, ураду, парламенту і, вядома, інстытуту прэзідэнцтва.**

Калі жыхары не ведаюць, з кім вырашыць мясцовыя праблемы на пярвічным узроўні, яны адразу ідуць да ўлад больш высокага ўзроўню. Таму неабходна развіваць ОТГС, каб людзі ведалі, куды ў першую чаргу звяртацца. Гэта павысіць актыўнасць грамадзян, адказнасць за вырашэнне канкрэтных задач, напрыклад, за добраўпарадкаванне тэрыторыі, за падтрымку бяспекі.

Дарэчы першы камітэт грамадскага самакіравання ў Мінску быў зарэгістраваны ў Маскоўскім раёне ў пачатку 1990 года. Напрыканцы года ў сталіцы дзейнічала ўжо 57 такіх грамадскіх органаў самакіравання. Зараз яны працуюць у кожным са 129 мікрараёнаў. Ёсць старшыя па пад'ездзе і па доме, дамавыя ці вулічныя камітэты (у месцах прыватнай забудовы), камітэт ОТГС па мікрараёне, органы жыллёвых і гаражна-спажывецкіх кааператываў, саветы інтэрнатаў... Практыка паказвае, што залог развіцця самаарганізацыі — не толькі ў грамадзянскай актыўнасці, але і ў падтрымцы з боку Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінгарвыканкама.

Грамадскае меркаванне па пытаннях эканамічнага, сацыяльнага і грамадска-культурнага развіцця ўлічваецца дэпутатамі гарадскога Савета падчас прыняцця рашэнняў на пасяджэнні сесій Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. ОТГС на аснове грамадскага меркавання могуць уносіць канкрэтныя прапановы па архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці, рацыянальным размяшчэнні прадпрыемстваў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, арганізацыі работы грамадскага транспарту, установ аховы здароўя, адукацыі, спорту і іншае. А таксама вызначаць рэжым працы. Такі падыход, напрыклад, павінен папярэдзіць канфлікты на ўзроўні, калі праект забудовы выносіцца на грамадскае абмеркаванне. Калі дэпутат працуе ў камісіі, ён звяртае ўвагу на тры важныя пытанні, па якіх выказаліся грамадзяне: праект бюджэту горада і інвестыцыйная праграма, прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця і мэтавыя праграмы развіцця сталіцы.

Камітэт ОТГС істотна дапамагае ЖЭСам і адміністрацыям раёнаў у рабоце з насельніцтвам. Ён прыцягвае грамадзян да добраўпарадкавання і рамонту жылых дамоў. Гэта датычыцца, перш за ўсё, шматпавярховікаў. Органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання садзейнічаюць у прафілактыцы правапарушэнняў, прыцягненні жыхароў мікрараёна да актыўнай правааховнай дзейнасці ў складзе грамадскіх пунктаў аховы правапарадку, дапамагаюць у арганізацыі вольнага часу.

**Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце,** лічыць, што ОТГС не валодаюць ключавымі прыкметамі ўлады. Іх стварэнне не з'яўляецца абавязковым, яны не маюць публічных паўнамоцтваў, няма і стабільнай крыніцы фінансавання іх дзейнасці. Узмацненне ролі мясцовага самакіравання, якое базіруецца на ўліку жыццёва важных інтарэсаў насельніцтва і актыўным удзеле ў кіраванні самых грамадзян, з'яўляецца адной з неад'емных задач любой сучаснай дзяржавы. Але, як паказвае жыццё, ОТГС як адну з формаў арганізацыі грамадскай актыўнасці складана арганізаваць. Хоць заканадаўча ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» вызначаны мэтавыя кірункі дзейнасці ОТГС, але ў рэальнай практыцы іх змест часцей зводзіцца да пытанняў добраўпарадкавання і падтрымання чысціні дваровых тэрыторый. Іншыя кірункі дзейнасці прадстаўлены вельмі нязначна альбо адсутнічаюць. Работа ОТГС па вялікім рахунку трымаецца на арганізатарах-энтузіястах, часцей сталага ўзросту.

— Сёння акрамя Беларусі, гэтая форма (ОТГС. — **Аўт.**) у тым ці іншым выглядзе прысутнічае ў большасці краін СНД. Аднак да канца сацыяльны патэнцыял гэтай формы самакіравання не рэалізаваны, — кажа **Георгій КУНЕВІЧ, старшы выкладчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.** — У сувязі з гэтым важнае значэнне набываюць, па-першае, палітыка-прававая прырода грамадскага самакіравання, па-другое, нарматыўна-прававая база і кірункі яе ўдасканалення, па-трэцяе, прававыя формы ўзаемадзеяння органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання з органамі дзяржаўнай улады, мясцовымі Саветамі, мясцовымі выканаўча-распарадчымі органамі, а таксама ўзаемадзеянне з грамадзянамі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

# ПРАБЛЕМНЫ ПРЫПЫНАК

## Калі за паездку трэба плаціць двойчы...



Той самы прыпынак у пасёлку Сосны, дзе жыхары гарадка чакаюць, пакуль можна будзе рушыць дадому.

**Лепш кепска ехаць, чым добра ісці, сведчыць народная прымаўка. З гэтым катэгарычна не згодны жыхары ваеннага гарадка Сосны, што зусім недалёка ад сталіцы. Расклад руху аўтобусаў паміж ім і аднайменным пасёлкам разуменню паддаецца з цяжкасцю. Гэта прызнаюць нават спецыялісты. Насельнікі пасёлка Сосны дабіраюцца ад метро да дому за 20 хвілін, а тыя, хто з гарадка Сосны, — за 30—40, хоць паміж «цёзкамі» ўсяго 1,5 кіламетра. Усё таму, што канцавы прыпынак «Сосны» ў аўтобуса зроблены менавіта ў пасёлку. Даязджаючы туды, транспарт стаіць яшчэ дзесяць хвілін. І пасажыры, якія жывуць у ваенным гарадку (куды аўтобус пойдзе пасля гэтага), вымушаны чакаць у салоне.**

### ВОСЕМ МАРШРУТАЎ НА ДЗВЕ ВУЛІЦЫ

«Чаму канцавы прыпынак зрабілі менавіта ў пасёлку, і навошта аўтобус увогуле стаіць там? Людзі ж і ў гарадку жывуць. Вясемдзесяць столькі ў салоне з двума маленькімі дзецьмі досыць цяжка, ды і часу колькі марнуецца. Пасажыры, што выходзяць у пасёлку, ужо вячэраць сядаюць, а мы ўсё дадому едзем. Няхай аўтобус адстойваецца гэтыя 10 хвілін у нас у гарадку, калі ўсе жыхары з горада прыедуць, а не толькі тыя, што ў пасёлку!» Такую скаргу-прапанову рэдакцыя атрымала ад Марыі КАЛЕЙНІК, жыхаркі ваеннага гарадка Сосны. Разабрацца ў хітрым раскладзе руху карэспандэнт «Звязды» папрасіла дапамагчы **Аляксея КАСІНСКАГА, намесніка начальніка аддзела арганізацыі пасажырскіх перавозак ДУ «Сталічны транспарт і сувязь».**

Рух, арганізаваны па дзвюх вуліцах: Паўлоўскага — у ваенным гарадку і Красіна — у пасёлку, сапраўды складаны. Транспарт тут ходзіць па васьмі маршрутах: 110, 160, 161, 168, 110а, 160а, 161а, 168а. Аўтобусы без літары заязджаюць спачатку на Паўлоўскага, а потым на Красіна і ходзяць з раніцы да 14:30. А з літарай «а» — курсіруюць пасля абеду і з Мінска ідуць адразу на Красіна, а пасля на Паўлоўскага. Канцавыя ж прыпынкі, якія адначасова з'яўляюцца і разваротнымі кольцамі, у іх розныя. У 160-га — «Інстытут фізікі», у 168-га — «Трайпл», у 110-га — «Сосны», у 161-га — палігон «Трасцянецкі». Пры гэтым на канцавым прыпынку «Сосны» ў пасёлку аўтобус стаіць днём 8 хвілін перад адпраўкай на Мінск, а вечарам у гадзіны пік — столькі ж, перш чым рушыць у гарадок.

Прычына стаяння, аказваецца, не адпачынак шафёра ці адстойванне транспарту. Вадзіцель проста чакае, пакуль у ваенны гарадок паедзе папярэдні аўтобус.

— На канцавы прыпынак «Сосны» аўтобус 110 прыязджае прыкладна ў той час, калі 160-ы ўжо развярнуўся на «Інстытуце фізікі» (гэты прыпынак яшчэ на кіламетр далей углыб лесу) і кіруецца ў ваенны гарадок. Калі 110-ы не будзе стаяць, то ў гарадок прыйдуць адначасова два аўтобусы, а час прыбыцця наступнага рэйса адразу павялічыцца на 10 хвілін. У выніку атрымаецца правал у графіку руху паміж аўтобусамі ледзьве не ў паўгадзіны, — растлумачыў Аляксей Касінскі. — Каб гэтага не здарылася, аўтобус і стаіць на канцавым у Соснах, а паміж рэйсамі захоўваецца інтэрвал прыкладна ў 15 хвілін.

### ЗМЕНІШ АДНАГО — ПАСЫПЛЮЦЦА ЎСЕ

Што зрабіць, каб транспарт не стаяў на канцавым прыпынку? Адзіны спосаб — пусціць удвая больш аўтобусаў і здрабніць маршруты, лічаць спецыялісты:

— Цяпер на Красіна і Паўлоўскага аптымальна працуе сем машын. Каб жыхарам гарадка і пасёлка не прыходзілася чакаць і ездзіць кругамі, трэба арганізаваць прамыя маршруты. З Мінска на Паўлоўскага, з Мінска на Красіна, рэйс непасрэдна паміж Красіна і Паўлоўскага, а таксама прамыя на «Трайпл», інстытут і палігон. Для гэтага спатрэбіцца не менш за 15 машын. Аднак інтэрвал паміж найбліжэйшымі аўтобусамі на кожным маршруце будзе тады не 10 хвілін, а 20, а днём яшчэ больш.

— Чаму нельга, каб аўтобус стаяў 10 хвілін не ў Соснах, а ў ваенным гарадку? — цікаўлюся ад імя чытачкі.

— Тады будуць незадаволены тыя, хто збіраўся ехаць у Мінск, і вымушаны 10 хвілін чакаць на Паўлоўскага. Акрамя таго, 110-ы і 160-ы апынуцца разам у гарадку, і людзі пачнуць блытацца, хто з іх едзе цяпер, а хто пастаіць. Паверце, ніхто не будзе глядзець на лічбы-літары. Паміж Паўлоўскага і Красіна вілачная схема руху, і яе ніяк не зменіш. Або адны будуць пакутаваць, або іншыя.

— Чаму тады не змяніць расклад руху аўтобусаў, каб пасажыры маглі выйсці на прыпынку «Універсам», што перад канцавым «Сосны» і паспелі перабегчы ў 110-га, які будзе 10 хвілін стаяць на канцавым, у 160-ы, які ўжо едзе з Інстытута фізікі?

— Тэарэтычна гэта магчыма. Аднак усе рэйсы і час руху жорстка прывязаны да працоўнага графіка Інстытута фізікі, «Трайпла» і смецævага палігона. Іх мы не можам ссунуць ні на хвіліну. Можна паспрабаваць змяніць толькі расклад 110-га, але праблема ў тым, што маршрут кожнага аўтобуса на працягу дня мяняецца. Уявім, што мы адправім 110-ы з дыспетчарскай станцыі «Аўтазаводская» на 5 хвілін пазней. Ён не будзе стаяць 10 хвілін у Соснах. Аднак, высадзіўшы людзей у гарадку, яму адразу прыйдзецца весці пасажыраў на Інстытут фізікі і перапраграмоўваць сваё табло на 160-ы нумар. А што, калі не паспее? Варта нам зрабіць хоць бы адзін маршрут на 5 хвілін пазней, як «пасыплецца» графік іншых аўтобусаў. Яны таксама пойдуць пазней, і ў выніку мы ўсё роўна сутыкнёмся з тым, што рэйс 110-га супадзе з рэйсам 160-га, які мы ссунуць не можам. Акрамя таго, атрымаецца рваны інтэрвал руху пры ад'ездзе аўтобусаў ад метро: то 10 хвілін будзе паміж імі, то 20 замест цяперашніх 15.

### ДВА ТАЛОНЫ НА АДНУ ПАЕЗДКУ

Акрамя 10-хвіліннага чакання, у жыхароў Соснаў існуюць таксама пытанні з сістэмай аплаты праезду. Калі аўтобус прыязджае на канцавы прыпынак, сістэма валідатараў аўтаматычна абнуляе паказчыкі, і атрымліваецца, што далей, да гарадка, чалавек ужо едзе «зайцам». Нават калі ён не выходзіў з аўтобуса, павінен аплаціць праезд нанова. Такіх маршрутаў, якія не маюць канцавога прыпынку, а едуць назад праз разваротны круг, па горадзе каля 70.

Транспартнікі ведаюць гэтую праблему, аднак перарабіць маршруты можна не ўсюды, вось як у Соснах, напрыклад. Кантралёры ў гэтым выпадку таксама праяўляюць памяркоўнасць. Тым больш што яны могуць паглядзець на сваім тэрмінале, калі чалавек аплаціў праезд. Аднак сістэма ўсё роўна будзе сцвярджаць, што ты безбілетнік.

— Лепш чым цяпер, у Соснах фактычна ўжо не зробіш. Можа стаць толькі горш, — лічыць Аляксей Касінскі. — Каля смецevага палігона, што за ваенным гарадком, неўзабаве пачнуць будаваць могілкі. І праз вуліцу Паўлоўскага спачатку пойдзе будаўнічая тэхніка, пасля — пахавальныя працэсіі. Затое з'явіцца, пэўна, дадатковы маршрут ад станцыі метро «Магілёўская» да могілак. Ён якраз будзе напрамую ісці адразу ў гарадок, а не ў пасёлак.

Такі вось вынік. Змяніць нічога нельга, але яшчэ год-два пачакаць — і можна будзе адразу ездзіць прамым рэйсам на могілкі.

Пакуль матэрыял рыхтаваўся да друку, транспартнікі паведамілі, што зноў перагледзелі расклад. Яны паабяцалі, што хоць поўнасцю стаянку не адменяць, але літаральна на днях зменшаць яе час з 8 хвілін да 6.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

ДАВАЙЦЕ РАЗБЯРОМСЯ

# БАЛКОНЫ — ТАК, ЛІЧЫЛЬНІКІ І ВОКНЫ — НЕ



## Што абяцае капітальны рамонт

**КАЛІ гаворка заходзіць пра рамонт, у большасці людзей з'яўляецца трывожны выраз твару, бо гэта сапраўдная катастрофа кватэрнага маштабу. А калі «ў перспектыве» капітальны рамонт увогуле ўсяго дома, то, здаецца, недалёка і да нервовага ціку... Са спецыялістамі ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» мы пагаварылі пра тое, як вызначаюцца дамы-«кандыдаты» на капрамонт, што ўваходзіць у абавязковы пералік работ, ці хутка, у адпаведнасці з нарматывамі, рамонт павінен быць завершаны.**

Што датычыцца 2017 года, то да яго заканчэння ў Мінску плануецца ўвесці — пасля капітальнага рамонту — 163 жылыя дамы. Больш за ўсё, 27 збудаванняў, адрамантавана ў самым вялікім раёне горада — Фрунзенскім, на другім месцы з паказчыкам, усяго на адну лічбу меншым, Першамайскі раён, а вось у Кастрычніцкім раёне пад капітальны рамонт было падведзена толькі 10 жылых дамоў.

Дарэчы, праграмы капітальнага рамонту жыллёвага фонду распрацоўваюцца асобна ў кожным раёне. Гэта звязана з вылучэннем сродкаў праз фінансавыя аддзелы адміністрацый раёнаў і балансавай прыналежнасцю жылфонду. Спіс складаецца заказчыкамі — КУП ЖКГ раёнаў — у залежнасці ад прадугледжаных фінансавых сродкаў і на падставе перспектыўных планаў капітальнага рамонту, якія распрацоўваюцца па выніках абследаванняў і тэхнічнага стану жыллёвага фонду і зацвярджаюцца рашэннем Мінгарвыканкама. Перспектыўная праграма складаецца на пяць гадоў і з'яўляецца падставай для фарміравання бягучых графікаў на год.

Цяпер што датычыцца ўмоў таго, каб трапіць у спіс. Тут улічваецца тэхнічны стан не толькі дома ў цэлым, але і яго канструктыўных элементаў і інжынерных сістэм у прыватнасці. Гэта вызначаюць арганізацыі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі. Акрамя таго, звяртаецца ўвага на тэрмін службы; архітэктурна-планіровачныя якасці жылога дома і ўзровень яго добраўпарадкавання; генеральны план жылой забудовы — вуліц, кварталаў, мікрараёнаў, у якой размешчаны дом; правілы і нормы яго эксплуатацыі. На падставе вынікаў і складаецца спіс «першачаргавікоў».

План рамонту па кожным доме фарміруецца асобна, у залежнасці ад існуючых у ім праблем, але з улікам агульнага спіса тыповых работ. Далей праектна-каштарысная дакументацыя праходзіць пазаведамасную дзяржаўную экспертызу. Усе рамонтна-будаўнічыя работы пасля яе зацвярджэння ў абавязковым парадку павінны быць выкананы.

### Без унясення дадатковай аплаты з боку жыхароў праводзяцца наступныя віды работ:

— рамонт і замена ўнутрыдамавых інжынерных сістэм электра-, цепла-, газа-і водазабеспячэння, водаадвядзення, супрацьдымнай абароны, установак супрацьпажарнай аўтаматыкі, а таксама каналізацыйных выпускаў;

— рамонт і замена інжынернага абсталявання, якое забяспечвае спажыванне камунальных паслуг, а таксама ўстаноўка цеплаабменнікаў і сістэм аўтаматычнага рэгулявання цеплавой энергіі;

— рамонт даху;

— рамонт фасадаў з устараненнем сырасці і прадзіманасці іх асобных фрагментаў;

— замена запаўненняў аконных і ўваходных дзвярных праёмаў, размешчаных у дапаможных памяшканнях;

— рамонт і аднаўленне апорнай здольнасці канструкцыйных элементаў, у тым ліку балконаў і лоджый, замена агароджаў балконаў і лоджый;

— устаноўка і замена казыркоў над уваходамі ў пад'езды, падвалы і над балконамі верхніх паверхаў;

— рамонт падмурка, аднаўленне адмосткі;

— устаноўка маланкаадводаў;

— усталёўка сігналізатараў выяўлення чаднага газу;

— аднаўленне прыдамавога добраўпарадкавання і азелянення, аздабленне жылых і дапаможных памяшканняў жылых дамоў, парушаных пры правядзенні работ па капітальным рамонце.

### За кошт уласнікаў жылых памяшканняў і пры іх жаданні ажыццяўляюцца:

— замена і рамонт электрычнага, газавага, санітарна-тэхнічнага і іншага абсталявання;

— устаноўка, замена і рамонт прыбораў уліку расходу вады, цеплавой і электрычнай энергіі, газу, у тым ліку тых, якія знаходзяцца ў дапаможных памяшканнях;

— абслугоўванне ўнутрыкватэрнай электраправодкі.

Гэтыя работы могуць быць выкананы эксплуатуючай арганізацыяй па бытавых паслугах, якія аказваюцца насельніцтву.

**Увага! У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам замена вокнаў у кватэрах не ўваходзіць у пералік работ пры капітальным рамонце жыллёвага фонду.**

Што датычыцца ўцяплення фасадаў, то ўжо падрыхтаваны праект нарматыўнага прававога акта: ён прадугледжвае рэалізацыю энергаэфектыўных мерапрыемстваў, якія атрымалі назву цеплавая мадэрнізацыя, з прыцягненнем сродкаў уласнікаў жылых памяшканняў. Акрамя таго, прапрацоўваецца магчымасць выдачы крэдытаў на гэтыя мэты.

Крыніцамі фінансавання капітальнага рамонту жыллёвага фонду з'яўляюцца мясцовы бюджэт і адлічэнні ўласнікаў жылых і нежылых памяшканняў. Дарэчы, узровень кампенсацыі затрат насельніцтвам складае каля 40% ад запланаванага фінансавання.

Тэрмін правядзення капітальнага рамонту — у сярэднім 3,5—4,5 месяца. Ці вытрымліваецца ён — іншае пытанне. Не пазней як за 10 дзён да яго пачатку павінны быць складзены графікі выканання работ па кожным пад'ездзе і заключаны дагаворы на аказанне паслуг. Для вызначэння выканаўцы праводзяць падрадныя таргі. Гэта датычыцца як капітальнага рамонту жылога дома, так і закупкі ліфтавага абсталявання і яго замены.

Яшчэ да заключэння дагавора арганізацыя, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) якая аказвае жыллёва-камунальныя паслугі, абавязана праінфармаваць на агульным сходзе ўласнікаў, наймальнікаў жылых памяшканняў, членаў арганізацыі забудоўшчыкаў аб парадку арганізацыі работ, іх відах і аб'ёмах, а таксама аб адказных за гэта службовых асобах. Пры гэтым афармляецца пратакол сходу. Таксама на сходзе выбіраецца ўпаўнаважаны прадстаўнік дома для правядзення перадрамонтнага агляду жылых памяшканняў. Па яго выніках можна скарэктаваць праектна-каштарысную дакументацыю.

Даведацца, ці патрапіў ваш дом у запаветны, а для кагосьці і палохаючы, спіс, можна будзе ў пачатку наступнага года. Перспектыўныя праграмы і бягучыя графікі капітальнага рамонту зацвярджаюцца раённым, гарадскім выканаўчымі камітэтамі, мясцовай адміністрацыяй раёна ў горадзе і да 1 лютага кожнага года публікуюцца ў сродках масавай інфармацыі, размяшчаюцца на інфармацыйных сайтах мясцовых адміністрацый.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

НЕ ДА ЖАРТАЎ

# ЗАМЕСТ ФУТРА ЖОНЦЫ — «ФУТРА» ДОМУ

## Гісторыі мінчан, якія вытрывалі капітальны рамонт

**Да чаго рыхтавацца тым, хто сутыкнецца з капітальным рамонтам у найбліжэйшы час, — з першых вуснаў.**

Больш за ўсё праблем звычайна ўзнікае ў жыхароў бакавых кватэр і апошніх паверхаў. Ірыне з сям'ёй не пашанцавала ўдвая: яны жывуць на дзявятым паверсе ў першым пад'ездзе. Дарэчы, дом — аднагодак гаспадыні кватэры, яго ўзвялі яшчэ ў пачатку 70-х. З таго часу ніякіх глабальных работ па абнаўленні не праводзілася. Як цяпер жартуе жанчына: «Я, у адрозненне ад дома, захавалася значна лепш». Аднак да вясёлага настрою Ірына вярнулася толькі цяпер, праз паўгода пасля завяршэння эпапеі з рамонтам. А вось у яго пачатку было зусім не да жартаў.

Многія лічаць апошні паверх вялікай перавагай. Па-першае, ніякага «тупату» ад любімых суседзяў, па-другое, добры від з акна, па-трэцяе, не так чуваць, што робяць на лавачках па начах падлеткі. Але пра ўсё гэта забываеш, калі заўважаеш на сценах нязменную спадарожніцу залішняй вільгаці — цвіль. Змагацца з ёй знутры бессэнсоўна, як сцвярджае жанчына. Былі апрабаваныя ўсе метады, але нават калі на час плямы знікалі, то потым вярталіся ізноў, каб пышным узорам заквітнець на шпалерах па ўсіх пакоях. У надзеі пазбавіцца нарэшце ад такога «дэкору» сям'я і чакала капітальнага рамонту, тэрміны якога пераносілі некалькі разоў. Калі яны нарэшце былі названы канчаткова, жыхароў дома спасцігла расчараванне: суцэльнае ўцяпленне вонкавых сцен больш не ўваходзіла ў пералік абавязковых работ.

Аднак жыхарам прапанавалі альтэрнатыву: яны маглі замовіць уцяпленне або, як яго па-іншаму называюць, тэрмашубу за свой кошт. Гэта выклікала сур'ёзныя спрэчкі паміж суседзямі. Ірына ўспамінае, як на агульным сходзе адзін мужчына крычаў: «Я гэтыя грошы збіраў на футра жонцы, а не дому!» Але любоў да камфорту ўсё ж перамагла, і дом уцяплілі.

А вось што расказала маладая пара Яўген і Алена.

— Мы вырашылі не збіраць на новабудоўлю, а хутчэй засяліцца ў сваё жыллё, таму набылі маленькую кватэрку ў даволі старым доме. Але калі з не самым прыемным абліччам фасада гатовыя былі мірыцца, то ўнутры хацелася ўсё ўладкаваць па-свойму. Дасведчаныя сваякі адгаварвалі: ваш дом стаіць на чарзе на капрамонт — пачакайце. Мы не верылі, думалі, пакуль ён да нас дойдзе...

Таму вестка пра пачатак капрамонту стала сапраўдным узрушэннем. Яшчэ ў большы шок увагнала яго правядзенне. Для замены камунікацый даводзілася здымаць свежапакладзеную плітку ў санвузле і на кухні, часткова бурыць сцены. А дзе такія работы, там і бруд, драпіны і іншыя «радасці», якія ніяк не злучаюцца з нядаўна завершаным унутрыкватэрным рамонтам.

— Нават беспярэпынны шум і пастаянны будаўнікоў, якія перыядычна з'яўляюцца за тваімі вокнамі, не ідуць ні ў якое параўнанне з расчараваннем з нагоды намаганняў, прыкладзеных дарма. Вельмі хацелася б, каб спісы на капітальныя рамонты былі больш дакладныя і вывешваліся ў пад'ездах як мінімум за год, — адзначае Алена.

Дарэчы, тыя, хто перажыў капрамонт, сыходзяцца ў адным: нельга пускаць усё на самацёк, неабходна ўважліва знаёміцца з каштарысам і прапановамі па дадатковых відах работ, а таксама сачыць за ходам правядзення рамонту. Наракаць на камунальныя службы можна бясконца, але менавіта ад нас залежыць, як мы будзем жыць.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# ПА КІМ ПЛАЧА КАПРАМОНТ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— У спіс першачарговых трапляюць менавіта тыя дамы, дзе больш за ўсё праблем, — кажа Андрэй Мацюшонак. — Складаецца перспектыўны графік на пяць гадоў, у адпаведнасці з ім кожны год адбываецца невялікая карэкціроўка. Дамы больш новыя, якія не патрабуюць вялікіх капіталаўкладанняў, стараемся падтрымліваць бягучым рамонтам. Робім касметычныя частковыя рамонты фасадаў, рамонт адмосткі, асобных участкаў даху. Пад капрамонт часта трапляюць тыя дамы, жыхары якіх нават не здагадваюцца, што гэта патрабуецца. Дзесьці балконная пліта прагнулася, дзесьці ў падвале падмурак прасеў, адбыліся нейкія разбурэнні канструктыўных элементаў — апорных сцен, фундамента.


Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.
Пасля капрамонту будынкі ў Клічаве як новыя.

У якасці заказчыкаў капітальных рамонтаў выступаюць камунальныя арганізацыі, якія займаюцца абслугоўваннем жыллёвага фонду. Камунальнікі аб'яўляюць электронныя таргі і шукаюць падрадных будаўнічыя арганізацыі, якія маюць адпаведныя дакументы для правядзення такіх работ. У тым жа Клічаве сёлета працавалі ў асноўным арганізацыі Магілёўскай вобласці, і толькі па чатырох дамах праектную дакументацыю на капрамонт рабілі гомельскія спецыялісты.

— Спраектаваць новы дом можа любы інстытут, а вось зрабіць дакументацыю для дома, які становіцца на капітальны рамонт, — не, — тлумачыць Андрэй Мацюшонак. — Тут патрэбна і дадатковая ліцэнзія, і спецыялісты адпаведныя, і прыборы для абследавання канструкцый. Цяпер ёсць такія прыборы, якімі можна прасвяціць нават пліту перакрыцця і паглядзець, што ўнутры. Бывае, што знешне яна выглядае добра, а на самай справе ў ёй ужо адбыліся сур'ёзныя змяненні. Інстытут аналізуе наш акт абследаванняў, супастаўляе са сваімі вынікамі і дае заключэнне, што трэба мяняць, а што пакінуць так, як ёсць. На падставе гэтага і вызначаецца аб'ём работ. Інстытут жа дае гарантыю, што пасля капрамонту дом і асобныя яго канструкцыі будуць служыць бездакорна як мінімум пяць гадоў.

## Колькі каштуе капрамонт

Кошт капрамонту залежыць ад аб'ёму работ, якія будуць праведзены. А гэта і праектныя даследаванні, і непасрэдна рамонт. Напрыклад, капрамонт двухпавярховага 8-кватэрнага дома ў Клічаве сёлета абыходзіўся прыкладна ў 58—59 тысяч рублёў, а 90-кватэрнага — больш чым у 240 тысяч.

Капітальны рамонт мае на ўвазе вяртанне дому першапачатковых уласцівасцяў. Гэта электрамантажныя работы, аднаўленне інжынерных сетак, канструктыўных элементаў будынка, зазямленне, патрабаванні да якога цяпер ускладніліся. Раней пры капрамонце за бюджэтны кошт праводзілася уцяпленне будынка, мяняліся вокны, але з 2014 года гэта робіцца выключна за кошт грамадзян. У сваю чаргу, новаўвядзенне дало магчымасць капітальна рамантаваць штогод большую колькасць дамоў.



На гарадскіх і раённых афіцыйных сайтах друкуюцца перспектыўныя праграмы і цякучыя графікі капітальнага рамонту, адпаведная інфармацыя праходзіць і праз СМІ. Перад пачаткам работ адбываецца сход, дзе жыхарам расказваюць, што плануецца зрабіць.

У кожным раёне імкнуцца як мага больш работ адолець сваімі сіламі. У тым жа Клічаве сёлета «Жылкамгас» адрамантаваў чатыры дамы з 18 і яшчэ на 190 тысяч рублёў зрабіў бягучыя рамонты. Рамонтна-будаўнічы ўчастак гэтага прадпрыемства дастаткова моцны. Раней гэта наогул была асобная будаўнічая арганізацыя «Рамбуд», якую ў працэсе рэарганізацыі далучылі да «Жылкамгаса».

## Калі запавольваецца тэмп...

Сёлета ў Магілёўскім раёне ў планах капітальна адрамантаваць сем дамоў агульнай плошчай 5,3 тысячы квадратных метраў. На 14 снежня цалкам было адрамантавана тры дамы, а два — у стадыі завяршэння. Рамонт яшчэ двух прыйдзецца перанесці на наступны год у сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я.

Як адзначыў **намеснік старшыні па будаўніцтве Магілёўскага райвыканкама Уладзімір ЯСКЕВІЧ**, на тэмпы ўплывае тое, што грошы на капрамонт паступаюць са спазненнем, дзесьці з сакавіка. Каб усё дакументальна афарміць і выставіць на таргі, таксама патрэбны час. Сваімі сіламі атрымліваецца рамантаваць 2—3 дамы. Магчыма, можна было б зрабіць і больш, але са спецыялістамі часта ўзнікаюць праблемы. І гэта таксама запавольвае працэс. **Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела УКП «Жылкамгас» Магілёўскага раёна Нэлі ДОСАВА** дадае, што часам сам працэс правядзення таргоў прыцягвае не вельмі добрасумленныя падрадныя арганізацыі. Як вядома, удзельнічаць у таргах могуць як дзяржаўныя, так і прыватныя прадпрыемствы. Бываюць выпадкі, калі будаўнікі не выконваюць свае абавязацельствы.

У сярэднім кошт работ па капрамонце з улікам замены даху, уцяплення тарцоў будынка, замены каналізацыі і водаправода ў двухпавярховым жылым доме каштуе каля 70 тысяч рублёў.

## Ёсць пытанні

Новыя дамы — асобная «песня». У таварыстваў уласнікаў капрамонты вядуцца крыху па іншай схеме. Там адлічэнні жыхароў на гэтыя мэты акумулююцца на спецыяльных рахунках. **Сяргей ВЫСОЦКІ, старшыня магілёўскага жыллёва-эксплуатацыйнага прадпрыемства «Раднік-сервіс»**, расказвае, што асноўная праблема новых дамоў — гэта няякасныя будаўнічыя швы на «панэльках» і дахі, якія часта цякуць. За кошт адлічэнняў усё гэта і рамантуецца. Але ёсць балючы момант, які датычыцца бягучага рамонту. Не трэба блытаць гэта з касметычным рамонтам пад'ездаў, які робіцца за кошт жыхароў. Размова ідзе пра штогадовыя агляды інжынерных сетак, дахаў і падвалаў, каб усё функцыянавала як трэба. Калі дамы дзяржаўнага фонду атрымліваюць неабходныя на гэта сродкі з бюджэту, то для дамоў уласнікаў з выхадам новага Жыллёвага кодэкса адпаведныя выдаткі скараціліся.

Сяргей Высоцкі кажа, што ім прапануюць, каб на кожны дом быў адкрыты рахунак, але невядома, за кошт каго будынак павінен абслугоўвацца, і хто павінен будзе плаціць заробак бухгалтару. «Мы не першы год ваюем з гэтай праблемай, звяртаемся ў Міністэрства, але ніякіх тлумачэнняў пакуль няма», — кажа старшыня.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### У тэму

Камітэтам дзяржкантролю Магілёўскай вобласці праведзена праверка жыллёвых рамонтна-эксплуатацыйных упраўленняў Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў Магілёва, падчас якой высветлілася, што з больш чым 400 уласнікаў нежылых памяшканняў (што выкарыстоўваюцца ў камерцыйных мэтах — крамы, офісы і г. д.) на працягу 3—10 гадоў не спаганялася плата за капрамонт. Агульная сума склала 200 тысяч рублёў у год. Па прапанове Камітэта зараз прымаюцца меры па выпраўленні сітуацыі.

Таксама было выяўлена, што на працягу шэрагу гадоў згаданымі ўпраўленнямі не забяспечвалася спагнанне з многіх уласнікаў нежылых памяшканняў прадугледжаных заканадаўствам адлічэнняў за тэхнічнае абслугоўванне і санітарнае ўтрыманне дапаможных памяшканняў, выдаткаў на электраэнергію для асвятлення месцаў агульнага карыстання і работу абсталявання, а таксама кампенсацыі зямельнага падатку. Як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення кантролю за работай галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы КДК Магілёўскай вобласці Яўгенія МАКАРАВА**, нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў работнікаў згаданых прадпрыемстваў прывялі да недабору грашовых сродкаў і не лепшым чынам паўплывалі на правядзенне работ па капітальным рамонце.

МЕРКАВАННІ

## Як вы ацэньваеце санітарны стан вашага жыллёвага фонду?

**У цэлым, такое пытанне можна задаць любому, паколькі кожны чалавек звяртае ўвагу на чысціню ўласнага пад'езда, нават, выходзячы з раніцы на працу.**

**Старшыня Шаршунскага сельвыканкама Мінскага раёна Мікалай ПАНКЕВІЧ:**

— Ставіць нейкую адзнаку, напрыклад, як раней у школе — ад 1 да 5, ці як зараз — ад 1 да 10, я б не стаў, паколькі тут такой класіфікацыі няма. Галоўнае, што хачу сказаць: работа вядзецца, а бягучы рамонт робіцца. Несумненна, пытанні ёсць, але ж яны ёсць заўсёды і ўсюды. Гэта стандартныя запыты, якія ў адзін час складана вырашыць, але займаецца імі менавіта ЖКГ. Людзі адразу ідуць менавіта ў гэту арганізацыю з той ці іншай праблемай, а не да мяне. А раз не звяртаюцца да старшыні, значыць праблемы вырашаюцца аператыўна. Было адно пытанне нядаўна: у старых цепласетках, якія не дзейнічаюць, утварылася прабоіна. Мая задача — звязацца з кіраўніцтвам спецыяльнай службы, якая павінна хутка вырашыць гэтую праблему.

**Старшыня Верамейскага сельвыканкама Чэрыкаўскага раёна Ірына КРЫКСІНА:**

— Здавальняюча ацэньваю, але хацелася б большую колькасць пляцовак, на якіх можна было б размясціць спецыяльныя кантэйнеры для паасобнага збору другаснай сыравіны. Падобных пляцовак не хапае не толькі па аграгарадку Верамейкі, але і па ўсім сельсавеце. У мяне 20 населеных пунктаў — і ў нас іх аб'язджае аўтамабіль або трактар, які ўсё збірае па графіку і да якога, дарэчы, пытанняў няма. Калі гэтая праблема будзе вырашана? Цяпер нам адказваюць, што кантэйнераў няма ў наяўнасці. Але з цягам часу паабяцалі ўсё зрабіць. Пытанне не забылася, нас пачулі, рэакцыя ёсць. Увогуле, аграгарадок Верамейкі быў пабудаваны ў 1980 гады, аднак у нас кожны год па плане рамантуюцца дахі, уцяпляюцца дамы і гэтак далей. Галоўнае, што ўсё робім своечасова.

**Начальнік аддзела па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб камунальнага жыллёвага ўнітарнага прадпрыемства «Светач» (г. Светлагорск) Таццяна РУСАКОВА:**

— Стан жыллёвага фонду я ацэньваю як здавальняючы. Ці ёсць да чаго імкнуцца? Напэўна. Апошнім часам зваротаў зусім мала — літаральна два за апошні год. Людзі прасілі, каб памылі вокны ў некаторых памяшканнях агульнага карыстання. А што датычыцца скаргаў, напрыклад, на якасць уборкі, то іх няма наогул. Вядома, заўсёды ёсць бягучыя пытанні, якія вырашаюцца на месцах, але для гэтага чалавеку не трэба адразу пісаць паперу. Звароты юрыдычных асоб? Яны ёсць, але толькі па пытаннях арэнды памяшканняў, якія мы здаём, а таксама па разліку за іх. Спачатку былі некаторыя пытанні з нагоды аплаты і перыядычнасці правядзення работ па санітарным абслугоўванні, але цяпер усё ў парадку.

**Блогер, вэб-распрацоўшчык, спажывец паслуг ЖКГ Дзмітрый ВАЛАТКО (г. Мінск):**

— Стан — здавальняючы, праблем па ўборцы канкрэтна ў мяне ў доме, а таксама ў сяброў я не назіраю. Але ёсць праблемы з мясцовымі жыхарамі. Многія ігнаруюць правілы і этычныя нормы: кураць у пад'ездах, спраўляюць патрэбу ў ліфтах, не выкідваюць смецце ў смеццеправод, а ставяць яго побач. Праблема, калі ўспомніць класіка, не ў клазетах, а ў галовах... У гэтым выпадку камунальнікі робяць многае. Так, ёсць нейкія дробныя пытанні, зімой хочацца, каб прыбіралі часцей, а вокны ў пад'ездах мылі больш старанна. Але гэта не з'яўляецца асноўнай праблемай, паколькі чыста не там, дзе мыюць, а там, дзе не смецяць. Ці ёсць сэнс змагацца? Ёсць, але я не ведаю ніводнага дзейснага спосабу, як праводзіць гэтую барацьбу. Нават калі я злаўлю курца за руку, то не факт, што ён атрымае штраф. Калі я злаўлю чалавека, які спраўляе патрэбу ў ліфце, то як я дакажу гэты факт? Зона адказнасці перад суседзямі чамусьці заканчваецца дзвярыма ўласнай кватэры.

Як гэта перамагчы — пытанне філасофскае. Адразу рашэнняў назваць не магу. Ёсць агульныя рэчы, напрыклад, падымаць культуру насельніцтва. Але менавіта заўтра гэта вырашыць нерэальна. Ці дапаможа відэаназіранне? Яго трэба рабіць максімальна антывандальным — каб камеру нельга было фізічна адкруціць, каб яе можна было лёгка ачысціць ад фарбы. Дарэчы, добрае рашэнне прыдумалі ў Маскве — камеру ў пад'ездзе ўстанаўліваюць у спецыяльным паглыбленні — так, каб яе нельга было пашкодзіць. І колькасць моладзі, якая збіраецца там, рэзка знізілася. Ад такога відэаназірання ў Мінску я б не адмовіўся, бо гэта не так дорага.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# ...ПАЙШЛА «Ў НАРОД»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Бібліятэкар Аксана КРАСІНА зазначае: краязнаўчая літаратура і матэрыялы з электроннага архіва карыстаюцца попытам у чытачоў.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Пра гэтых знакамітых людзей, нашых землякоў павінны ведаць не толькі людзі старэйшага пакалення, але і дзеці, моладзь, — лічыць Вольга Радкевіч. — Таму працуем у гэтым кірунку сумесна з музеем Кузьмы Чорнага.

У адной з залаў бібліятэкі шмат мяккіх цацак. Вольга Радкевіч заўважае наша здзіўленне:

— Выхаванцы мясцовага дзіцячага сада частыя госці ў нас. Таму і гэтая зала аформлена для іх, каб вучыліся чытаць, засвойвалі матэрыял з дапамогай цацак. Менавіта такая мэта праграмы «Разам з кнігай мы расцём». Мая калега Аксана Красіна таксама наведвае дашкольную ўстанову, ладзіць для малых розныя конкурсы, гучныя чытанні кніжак, выкарыстоўваючы гульнявыя элементы.




Загадчыца Вольга РАДКЕВІЧ і адзін з наведвальнікаў — настаяцель мясцовай праваслаўнай царквы айцец Міхаіл.

Праграма «Будуй храм у душах» прадугледжвае духоўнае выхаванне падрастаючага пакалення. Бібліятэка знаходзіцца побач з царквой свяціцеля Мікалая Цудатворца. Сімвалічна, што храм духоўнасці суседнічае з храмам культуры. Налета на базе ўстановы плануецца адкрыць нядзельную школу для дзяцей.

Увогуле, бібліятэка цесна працуе з усімі арганізацыямі, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета. Яны дапамагаюць работнікам культуры, а тыя ў сваю чаргу ім — чым могуць. Падтрымліваюць усе пачынанні і Цімкавіцкі сельвыканкам, раённыя ўлады.

Работнікі бібліятэкі не чакаюць, пакуль да іх прыйдуць людзі, яны самі ідуць «у народ». У вёсцы Чарнагубава калісьці былі бібліятэка і клуб, якія закрылі. А населены пункт не такі і малы, тут пражывае за сто чалавек. І, вядома, сярод жыхароў шмат заўзятых чытачоў. Тыя, што не могуць прыйсці самі, тэлефануюць, каб ім прывезлі кнігі. Бібліятэкар Аксана Красіна вывешвае на будынку магазіна аб'явы з інфармацыяй: у які дзень будзе працаваць «выязная» бібліятэка. Бярэ з сабой фармуляры і вязе заказы.

Самыя актыўныя чытачы — школьнікі і пенсіянеры. Кацярына Дзятловіч з Цімкавіч — маналетні вязень фашысцкіх канцэнтрацыйных лагераў. Кацярына Яфімаўна шмат перажыла ў жыцці, але не страціла да яго цікавасці, яна пастаянная чытачка. Перавагу аддае гістарычнай літаратуры. Толькі вось зрок апошнім часам падводзіць. Таму жанчыне прыносяць кнігі, надрукаваныя вялікім шрыфтам.

Жыхар вёскі Канатопы Аляксандр Лагішанец па кнігі звычайна прыязджае на камі. Аднойчы быў цікавы выпадак, прыгадваюць у бібліятэцы: «У нас праходзіў абласны пленэр. І тут пад'язджае мужчына і прывязвае каня да плота. Усе засмяяліся — маўляў, вашы чытачы па кнігі на сваім транспарце дабіраюцца. Жонка Аляксандра Іванавіча таксама вельмі любіць чытаць».

Летам у бібліятэку наведваюцца навучэнцы каледжаў і ліцэяў, студэнты ўніверсітэтаў, абітурыенты. Хтосьці рыхтуецца да сесіі, а некаму патрэбна літаратура для паступлення ў навучальныя ўстановы.

— Калі няма патрэбнай кнігі ў фондзе, мы звяртаемся ў раённую бібліятэку. Калі і там не знаходзіцца, то заказваем па міжбібліятэчным абанеменце з Мінска, дасылаем заказ у абласную бібліятэку імя Пушкіна. Зрэшты, у нас нядрэнны фонд, кнігі разнастайнай тэматыкі: мастацкія, галіновыя. У сярэднім штодзень наведваецца па 20—25 чалавек, і гэта без уліку масавых мерапрыемстваў, якія ладзяцца даволі часта, — кажа Вольга Радкевіч.

Кнігі з паметкай «камерцыйны фонд» — платныя. Гэта літаратура, якая карыстаецца павышаным попытам, даведнікі, слоўнікі. У бібліятэцы ёй можна карыстацца бясплатна, але пры выдачы на дом бярэцца сімвалічная плата. Людзі разумеюць, што выгадней узяць яе ў бібліятэцы,чым купіць у кнігарні — надта дорага. «Таксама можна адсканіраваць патрэбныя старонкі. Тут ёсць неабходны комплекс, выхад у інтэрнэт, падключана электронная пошта, што значна аблягчае работу.

— З аднаго боку людзі прывыклі, што раней было ўсё дарам. Але ж трэба разумець: затраты на абслугоўванне, набыццё кніг неймаверныя, — лічыць загадчыца. — Мы не адмаўляемся і ад кніг і перыёдыкі, якія людзі прыносяць з дому. Адны пераязджаюць на новае месца жыхарства, іншыя робяць рамонт, мяняюць мэблю... І бібліятэка ад шчодрых падарункаў не адмаўляецца. Дарэчы, часам сустракаюцца даволі цікавыя рэчы.

Неяк людзі пры пакупцы дома на гарышчы знайшлі газеты за 1940 год. Прапанавалі бібліятэцы. Іх перабралі і пакінулі тыя, што добра захаваліся. «У нас ёсць часопіс «Бальшавік» за жнівень 1945 года, дзе змешчана канвенцыя трох дзяржаў, выразка з газеты «Сталінец» за 1942-гі са словамі «Смуглянкі». Нам падарылі і песеннік салдата. У звычайным вучнёўскім сшытку занатаваныя песні, вершы, датаваныя пэўным годам і месцам. Напрыклад, Шчэцін, 1945-ты, перапісана з дзённіка камандзіра. Усе гэтыя экспанаты паказваем на выставах. У прыватнасці, праводзілі мерапрыемства з нагоды пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Было шмат наведвальнікаў. Дзеці цікавіліся ўсім, прасілі дазволу дакрануцца да рэчаў», — расказала Вольга Радкевіч.

Ім, вядома, дазволілі. Дзеці павінны ўсё памацаць, праверыць. Даўно адышоў у нябыт стэрэатып, што ў бібліятэцы працуюць строгія цёткі ў акулярах, якія пастаянна патрабуюць цішыні. Сучасныя супрацоўнікі сельскіх бібліятэк, як можна меркаваць па Цімкавічах, — энтузіясты з творчым мысленнем, якія, нягледзячы на вельмі сціплую зарплату, атрымліваюць асалоду ад сваёй працы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

## У тэму

**Таццяна КРАЎЧОНАК, намеснік начальніка аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама:**

— У Мінскай вобласці функцыянуюць 450 публічных бібліятэк, у тым ліку 364 (81% ад агульнай колькасці) у сельскай мясцовасці.

Бясспрэчна, тэндэнцыя закрыцця асобных «неперспектыўных» сельскіх бібліятэк або рэарганізацыя іх ва ўстановы культуры змешанага тыпу (клуб-бібліятэка, бібліятэка-клуб) з улікам тэрытарыяльнай спецыфікі працягваецца. З пачатку 2017 года сетка публічных бібліятэк скарацілася на шэсць адзінак. Гэта абумоўлена галоўным чынам дэмаграфічнай сітуацыяй у вёсцы. Абслугоўванне аддаленых ад стацыянарных бібліятэк малаколькасных паселішчаў забяспечваюць 20 бібліёбусаў і 358 бібліятэчных пунктаў.

Адзіны фонд публічных бібліятэк вобласці, які з'яўляецца ўніверсальным па змесце і прадстаўлены разнастайнымі відамі выданняў, налічвае 71 млн экзэмпляраў дакументаў, з іх 3,2 млн экзэмпляраў — у сельскай мясцовасці.

Камп'ютарызавана 415 бібліятэк, у тым ліку 329 з іх — сельскія. Ва ўсіх цэнтральных раённых і гарадскіх бібліятэках ажыццяўляецца аўтаматызацыя працэсаў, паступова ўкараняецца абслугоўванне чытачоў у рэжыме анлайн.

Сёння публічныя бібліятэкі Міншчыны ўносяць свой уклад у павышэнне ўзроўню духоўнай культуры грамадства, захаванне і развіццё найлепшых традыцый культурнай адукацыі — выступаюць арганізатарамі шматлікіх свят беларускай і замежнай кнігі, прэзентацый новых выданняў, літаратурных і музычных вечарын, творчых сустрэч.

Акрамя таго, сельскі бібліятэкар — гэта і сацыяльны работнік, які клапоціцца пра адзінокіх, састарэлых, інвалідаў, абслугоўвае іх дома. А з укараненнем у практыку работы бібліятэк новых інфармацыйных тэхналогій у дзяцей і падлеткаў вялікую цікавасць выклікаюць такія формы мерапрыемстваў, як мультымедыйныя і віртуальныя падарожжы, бібліяглобусы і фотакросінгі, а таксама розныя квест-гульні.

---

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## ПАШПАРТЫСТЫ СВЯТКУЮЦЬ

**У нядзелю адзначылі сваё прафесійнае свята супрацоўнікі падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі органаў унутраных спраў краіны. Апошнія змяненні пашпартная служба Петрыкаўскага раёна перажывала ў час узначальвання яе Зояй Лазоранкай і Ігарам Гурыным, на чые плечы выпалі дастаткова цяжкія гады зававання аўтарытэту, як піша газета «Петрыкаўскія навіны».**

Сёлета аддзяленне ўзначаліў Васіль Сыцько, які дагэтуль працаваў там інспектарам. Не так даўно ў калектыў прыйшлі працаваць капітан міліцыі Віктар Дзегялевіч і спецыяліст Вікторыя Марчанка. А вось Тамара Сярапіна працуе пашпартысткай ужо даўно і дапамагае маладым калегам атрымаць практычныя веды і ўцягнуцца ў прафесію. Асноўная работа спецыялістаў — кансультаванне і афармленне дакументаў замежных грамадзян, якія хочуць мець від на жыхарства ў Беларусі, а таксама своечасовая замена пашпартоў мясцовых жыхароў.

## АБНАЎЛЕННЕ ТЭХНІКІ

**На Мінойтаўскім рамонтным заводзе прайшло выязное пасяджэнне Савета Лідскага раённага філіяла Гродзенскага абласнога Саюза наймальнікаў. Пра гэта напісала «Лідская газета».**

На прадпрыемстве сёння працуе 185 чалавек. Завод у Мінойтах выпускае сельскагаспадарчыя машыны, прызначаныя для апрацоўкі і культывавання глебы, а таксама для нарыхтоўкі кармоў. Уся тэхніка — распрацоўкі ўласнага канструктарскага аддзела. 40% прадукцыі пастаўляецца на экспарт — у асноўным у Расію, дзе маюцца ўласныя тавараправодныя сеткі ў рэгіёнах.

Сёлета асартымент папоўніўся каткамі, якія выраўноўваюць паверхні, і ўніверсальным модульным культыватарам. Зараз асвойваюць вытворчасць прычапной секцыйнай ротарнай касілкі. Плануецца, што ў бягучым годзе ўдзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме вытворчасці складзе 7%. Дарэчы, інвестыцыі ў асноўны капітал за кошт уласных сродкаў прагназуюць на ўзроўні 600 тысяч рублёў.

## ДАПАМОГА ПОБАЧ

**«Для чалавека, які знаходзіцца ў стане крызісу, прынцыповымі фактарамі з'яўляюцца ціск нявырашанай праблемы, пачуццё бездапаможнасці і безнадзейнасці. Асноўнай прычынай падлеткавых самагубстваў становіцца непадзеленае каханне. Пры гэтым бацькі вельмі часта не заўважаюць душэўную траўму дзіцяці або проста несур'ёзна ставяцца да яго праблемы», — тлумачыць псіхолаг Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бальніцы Анастасія САКАЛОЎСКАЯ. Да яе звярнулася карэспандэнт газеты «Авангард», каб высветліць, дзе можна знайсці дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях.**

Каб не заставацца са сваёй праблемай сам-насам, можна падзяліцца ёй са спецыялістам па тэлефоне даверу. У Буда-Кашалёве тэлефануйце псіхіятру-нарколагу (2-23-16), у Гомельскай вобласці — спецыялістам Гомельскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей (170, кругласутачна), у Гомелі — урачам Цэнтра пагранічных станаў (даведка — 8 (0232) 35-62-73), а таксама ў службу экстраннай псіхалагічнай дапамогі (8 (0232) 35-91-91).

## ЛЁС МУЗЫКІ

**Пётр Маўчан — талент Мядзельшчыны. Упершыню ўзяў гармонік у чатырохгадовым узросце: у бацькі была двухрадка, і Пётр са старэйшым братам спаборнічалі, хто лепш іграе. Нот не ведалі, развучвалі ўсё на слых. А праз нейкі час музыка стала лёсам. Адно з апошніх дасягненняў Пятра Маўчана — званне лаўрэата III ступені рэспубліканскага вакальнага конкурсу «Песні Перамогі», піша «Нарачанская зара».**

Па адукацыі Пётр — настаўнік фізічнай культуры. Працаваць пачынаў у вясковай школе Карэліцкага раёна. Там, у мясцовым калгасе, акампаніраваў на баяне для хору, год адпрацаваў і пайшоў у армію. «Камандзіры адразу выявілі музычныя здольнасці навабранцаў. Такім чынам трапіў у народны ансамбль песні і танца «Тачанка». Нот не ведаў, таму мяне ўзялі спяваць. Але ў эстраднай групе ансамбля іграў і на электрагітары», — расказвае музыкант. — У Сваткахаўскай школе пачаў працаваць з верасня 1971 года — і аддаў ёй сорак гадоў. Спачатку выкладаў фізічную культуру, а праз нейкі час і спевы. «Цяпер я — акампаніятар у Сваткаўскім клубе. Акрамя розных святочных мерапрыемстваў, і па вёсках ездзім з канцэртамі, і па фермах. Нікому не адмаўляю. Іграць і спяваць буду, пакуль жывы».

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

ПРАЕЗДАМ

# З ВЕТРЫКАМ ПА ГРАВІЙЦЫ...

## Хто і якім чынам рамантуе дарогі?

**У Буда-Кашалёўскім раёне 935 кіламетраў аўтамабільных дарог. У 2014 годзе тут праходзілі абласныя «Дажынкі», і на цэнтральных вуліцах быў праведзены капітальны рамонт. Аднак чым далей ад цэнтра, тым горш выглядае асфальт, а вясковыя вуліцы ўвогуле маюць альбо пясчана-гравійнае пакрыццё, альбо застаюцца звычайнай «грунтоўкай». Мы праверылі, наколькі зручна па іх ездзіць, а заадно высветлілі, якім чынам дасягаецца баланс паміж коштам рамонту і яго якасцю і чаму трэба паведамляць пра ямы пад вокнамі.**

### Падзел абавязкаў

**Намеснік старшыні Буда-Кашалёўскага райвыканкама Яўген ЛІСЕЙЧЫКАЎ** расказвае, што сёння за станам дарог сочаць тры прадпрыемствы. Найбольшы аб'ём работ замацаваны за дарожна-рамонтным будаўнічым упраўленнем №184. У самім горадзе Буда-Кашалёва і гарадскім пасёлку Уваравічы гаспадарыць «Буда-Кашалёўскі камунальнік», а дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне №46 абслугоўвае шляхі рэспубліканскага значэння.

— Сёлета з усіх крыніц фінансавання — рэспубліканскага, абласнога і мясцовага бюджэтаў — на дарожныя работы было выдзелена 1 мільён 982 тысячы рублёў. На гэтыя грошы прадпрыемствы зрабілі частковую падсыпку 36 вуліц агульнай працягласцю каля 31 кіламетра ў Гусявіцкім, Крыўскім, Марозавіцкім, Мікалаеўскім, Рагінскім, Патапаўскім і Уваравіцкім сельсаветах. Выканалі бягучы ямачны рамонт асфальтабетонных пакрыццяў. Безумоўна, праблема «дрэнных дарог» у раёне існуе. І яна, у асноўным, звязана з недахопам фінансавання. Каб поўнасцю навесці парадак, патрэбна прыкладна 13 мільёнаў рублёў. Вытрымаць такую нагрузку бюджэт не ў стане. Так што тэрмінова займаемся толькі крытычнымі выпадкамі — гэта калі праехаць у вёску не можа сацыяльны транспарт альбо ад жыхароў паступаюць скаргі. У астатнім прытрымліваемся плана.

### Куды паехаў грэйдар?

Куды менавіта трэба адпраўляць рамонтную брыгаду, вырашаюць уласнікі, за якімі замацаваны пэўны ўчастак. Спецыялісты аглядаюць палатно, і ў залежнасці ад яго стану складаюць план, які потым трапляе на разгляд у райвыканкам. Там могуць уносіцца карэктывы: напрыклад, нейкі ўчастак не трапіў у спіс, а жыхары скардзіліся на дрэнны стан пакрыцця. Калі скаргі частыя ці выпадак крытычны, парадак на вуліцы наводзяць па-за планам.

Падобная сітуацыя і з грэйдзіраваннем. На грунтавыя і пясчана-гравійныя трасы спецыяльная тэхніка выходзіць двойчы на год. Аднак надвор'е восенню, вясной, у час моцных дажджоў уносіць свае «карэктывы». У такіх выпадках грэйдар выязджае на месцы і часцей, па-за тэрмінамі. Праўда, перад тым як раўняць, трэба дачакацца, пакуль зямля падсохне, іначай карысць ад работы будзе мізэрная.

А вось патэлефанаваць і паведаміць пра непраходныя лужыны неабходна, бо гэта першы «індыкатар» таго, што на вуліцы непарадак. Напрыклад, сёлета ў райвыканкам прыйшло 16 зваротаў, работы па дзевяці з іх былі выкананы поўнасцю, астатнія дарогі прагрэйдзіравалі, каб паменшыць крытычную сітуацыю.





Два аблічча вуліцы Базарнай. Праехаць, як мы ўпэўніліся, можна. Ці з камфортам — пытанне іншае.

### Дарога складанага рэльефу

Летась райвыканкам вырашыў перадаць значную частку вуліц, якія раней абслугоўвала ЖКГ, на баланс ДРБУ. Камунальная гаспадарка — не спецыялізаванае на рамонце дарог прадпрыемства, акрамя згаданага абавязку яна выконвае яшчэ мноства «традыцыйных» для камунальнікаў спраў.

Не так даўно жыхар гарадскога пасёлка Уваравічы прыйшоў са скаргай да кіраўніцтва раёна. Мужчына абураўся станам вуліцы Базарнай, на якой стаіць яго дом, маўляў, пасля дажджу там ні праехаць, ні прайсці.

**Таццяна ТРОТНА, намеснік дырэктара КЖУП «Буда-Кашалёўскі камунальнік»**, згаджаецца, што да нядаўняга часу гэта была адна з самых «папулярных» у скаржнікаў дарог.

— У пасёлку Уваравічы найбольшы клопат выклікаў стан вуліц Базарная і Новая. Апошнім часам праблему ўдалося паменшыць, палову Базарнай засыпалі пясчана-гравійнай сумессю. Цяпер на павестцы — другая яе частка і вуліца Новая, з якой пэўныя цяжкасці. Дарога там складанага рэльефу: з аднаго боку, дзе стаяць дамы, пагорак, а з другога — наадварот, схіл. Няцяжка здагадацца, куды сцякае вада.

### Фінансавая гімнастыка

Чаму ж рамонт адбываецца толькі напалову? Праблема традыцыйная: абмежаваныя магчымасці бюджэту. Здавалася б, колькі там сродкаў патрэбна — усяго толькі прывезці машыну пяску і гравію, аднак кошт аднаго квадратнага метра паўнацэннай падсыпкі складае 7,5 рубля. «Вось і атрымліваецца, што падсыпка паловы Базарнай вуліцы абыйшлася прыкладна ў 13 тысяч рублёў. Пры агульным бюджэце ў 50 тысяч, які выдзелены прадпрыемству на падобныя мэты, сума велізарная», — дзеліцца Таццяна Тротна.

Частку праектаў ЖКГ наогул рэалізуе ў некалькі этапаў. Напрыклад, два гады таму выконваўся праект па ўкладцы плітачнага тратуара па вуліцы Леніна. Пасля таго як плітка з'явілася на адным баку дарогі, работа перапынілася, а на наступны год, з новым бюджэтам, была скончана. У паняцце «тратуар», па тлумачэннях спецыяліста, уваходзіць не толькі месца для праходу пешаходаў, пажадана, каб там быў яшчэ і бардзюр, і ліхтары вулічнага асвятлення. Сярод пастаянных абавязкаў камунальнікаў — добраўпарадкаванне прыпынкаў грамадскага транспарту і аднаўленне дарожнай разметкі. Прасцей кажучы, кожную вясну трэба маляваць «зебру» на пешаходных пераходах.

### Майстры на некалькі раёнаў

Ветка, Бадзёры, Бушаўка — гэтыя населеныя пункты знаходзяцца так блізка адзін ад аднаго, што выпадковы чалавек лёгка палічыць іх адной вялікай вёскай. Сёлета тут рудыя грунтовыя дарогі замянілі на шэрую «гравійку».

Калі раней на балансе ДРБУ-184 была толькі сетка дарог мясцовага значэння, інакш кажучы, прасёлкавыя дарогі паміж вёскамі, то летась пад нагляд спецыялістаў дарожна-рамонтнай службы трапілі непасрэдна вясковыя вуліцы.

— 3 240 кіламетраў амаль палова — грунтавыя, — зазначае **дырэктар ДРБУ-184 Аляксандр КУДЗЕЛЬКА**. Фактычна, вуліцы ніхто не будаваў, людзі намецілі, дзе будуць ездзіць і хадзіць, паставілі дамы з двух бакоў і назвалі гэта дарогай. Як вынік, у дажджы тэхніка выбівае каляіны...

Сёння ў дарожнікаў бадай самы вялікі парк спецыялізаванай тэхнікі, каля 80 рабочых і ўласная вытворчасць асфальтабетону. Ёсць лабараторыя, дзе будучае пакрыццё правяраецца на якасць. Арганізацыя прадае пясок, шчэбень, бартавы камень, тратуарную плітку як для арганізацый, так і для насельніцтва, шукае дадатковыя работы, напрыклад, выйграе тэндары ў Жыткавічах, Ветцы, Светлагорску.

### Не шыкоўна, але праедзем

Здаецца, вуліцы пры такім гаспадары павінны быць гладкія і роўныя. Некаторыя насамрэч набліжаюцца да ідэалу, але да паўсюднага асфальту яшчэ далёка, бо больш за палову дарожнага палатна раёна патрабуе капітальнага рамонту. Падобная сітуацыя не выключная, многія мясцовасці маюць такую ж праблему вялікага аб'ёму работ і сціплых магчымасцяў. Асабліва адчувальная сітуацыя зімой, калі трэба тэрмінова расчышчаць снег. Так, на 53 умоўныя кіламетры вуліцы, ДРБУ можа выдзеліць усяго адну адзінку тэхнікі.

— Пакуль што наша задача — зрабіць «грунтоўкі». Для гэтага рыхтуем аснову, заліваем палатно эмульсіяй і на яе ўжо сыплем падрыхтаваныя гравій і пясок. Пры лепшым раскладзе такая дарога павінна пратрымацца каля пяці гадоў, — тлумачыць дырэктар ДРБУ.

Падзелу на вялікія і малыя населеныя пункты дарожнікі не прытрымліваюцца. Але цудоўна разумець, што ў вёсачку, дзе ўсяго чатыры жылыя дамы, пракладваць трасу немэтазгодна, бо праз нейкі час жыхароў там яшчэ паменшае, і затраты не акупяцца. Таму даглядаюць вуліцы паўсюдна, а вось удасканаленне праводзяць у вёсках з перспектывамі.

### На рахунку маем...

Фінансаванне дарожнага рамонту мае свае акалічнасці. Сродкі выдзяляюцца з рэспубліканскага, абласнога і раённага бюджэтаў, у пэўных — асаблівых — выпадках прадпрыемства само дакладвае грошы на ліквідацыю парушэнняў. З усіх арганізацый толькі ДЭУ №46 поўнасцю фінансуецца з Рэспубліканскага дарожнага фонду — упраўленне даглядае трасы рэспубліканскага значэння, а ім удзяляецца асаблівая ўвага. Таксама ў прыярытэце цэнтральныя вуліцы, якія з'яўляюцца «тварам» населенага пункта.

У той жа час перыферыйныя і нетранзітныя вулачкі таксама не застаюцца без увагі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*



Уваравічы. Па нарматывах, у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу каля 70 працэнтаў дарог павінны быць заасфальтаваныя.

## Крок да самастойнасці

### У Краснаполлі прэзентавалі Цэнтр па навучанні навыкам самастойнага жыцця

**Ён запрацаваў пры аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў (раённы Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва). Ініцыятыва «Крок да самастойнасці» перамагла ў конкурсе праектаў «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», што падтрымліваецца ЕС—ПРААН.**

На рамонт памяшкання, набыццё мэблі, бытавой тэхнікі, а таксама мультымедыйнай устаноўкі і ўсяго астатняга, неабходнага для правядзення практычных заняткаў, было выдзелена 14 027 еўра. Прадстаўнікі ветэранскай арганізацыі, якія выступілі партнёрамі ініцыятывы, разам з маладымі інвалідамі распрацавалі тэхналагічныя карты страў і правялі па іх 16 майстар-класаў. Акрамя гэтага, быў падрыхтаваны і выдадзены зборнік рэцэптаў «Я таксама ўмею гатаваць».

Як адзначыла **старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН,** новы цэнтр дапаможа маладым людзям адаптавацца да жыцця ў грамадстве, навучыцца клапаціцца пра сябе і сваіх блізкіх.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

НА СЛЫХУ

## Супраць афрыканскай чумы — адбор проб у дзікоў

### Мінлясгас прапануе пераняць літоўскі вопыт

**Міністэрства лясной гаспадаркі ў хуткім часе плануе ўнесці шэраг прапаноў па барацьбе з афрыканскай чумой свіней (АЧС) у Беларусі і выйсці з імі на ўзровень урада, паведамілі ў прэс-службе гэтага ведамства.**

Гаворка, перш за ўсё, ідзе пра магчымае ўкараненне літоўскага вопыту, дзе сёння бярэцца адбор проб ва ўсіх асобін дзіка (у тым ліку ў здохлых). У выпадку станоўчага выніку жывёлу адпраўляюць на ўтылізацыю, адмоўнага — дазваляюць выкарыстоўваць тушу ў ежу. У суседзяў таксама функцыянуе сістэма стымулявання паляўнічых гаспадарак і паляўнічых, а за адбор проб і аналіз на АЧС плаціць дзяржава.

Беларусь на сёння застаецца адзінай краінай, якая не праводзіць стапрацэнтны адбор проб, а ўтылізуе ўсіх адстраляных дзікоў. Пры гэтым за кожную адстраляную асобіну дзяржава плаціць па сем базавых велічынь.

Па словах **начальніка аддзела паляўнічай гаспадаркі міністэрства Сяргея ШАСТАКОВА,** які нядаўна прыняў удзел у Міжнародным семінары па барацьбе з афрыканскай чумой свіней і дзікоў у Каўнасе (Літва), вакцыны ад распаўсюджвання чумы сёння не існуе. Таму першачарговыя меры па барацьбе з АЧС — прафілактычныя. Гэта мерапрыемствы па біялагічнай абароне на свінаводчых аб'ектах і зніжэнне колькасці дзіка ў дзікай прыродзе. Па словах спецыяліста, за апошнія тры гады папуляцыя дзіка ў Беларусі знізілася з 83 тысяч да 2,7 тысячы асобін. Асноўная прычына — праведзеныя мерапрыемствы па адстрэле жывёлы. А па інфармацыі замежных экспертаў, пры адстрэле дзіка АЧС фіксуецца ўсяго ў 2—4 працэнтаў асобін, і на 70 працэнтаў заражаны тушы здохлых жывёл.

Усяго на семінары свой вопыт змаглі прадставіць 15 краін. Галоўнай мэтай удзельнікаў стала абмеркаванне і азнаямленне з адноўленай эпідэміялогіяй АЧС у Еўропе, асновамі аховы здароўя дзікоў. Асобна было закранута пытанне біябяспекі палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «ДАЗВОЛЬЦЕ РУСІНАМ ПАСАДЫ ЗАЙМАЦЬ»

**МІНУЛЫ раз мы распавядалі пра функцыянаванне Полацкага магістрата. Сёння наш пастаянны эксперт па гісторыі мясцовага самакіравання, старшы навуковы супрацоўнік Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік» Максім Макараў прапануе даведацца пра канфесійны склад органаў улады самага старажытнага горада краіны ў XV—XVIII стагоддзях.**

## Паралізавалі каталіцкае лобі

— У эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу ўдзел прадстаўнікоў той ці іншай канфесійнай групы насельніцтва ў складзе органаў улады быў важным паказчыкам. Напрыклад, таго, якое месца гэтая група займае ў жыцці грамадства або пэўнай структурнай адзінкі. Для гісторыі Паўночнай Беларусі, дзе ў азначаную эпоху мела месца супрацьстаянне розных хрысціянскіх цэркваў, вывучэнне складу органаў мясцовых улад мае дастаткова актуальны характар, — расказвае гісторык.

Прывілеі на магдэбургскае права (1498 і 1509 гадоў) дазвалялі полацкаму магістрату з самага пачатку будавацца на прынцыпах канфесійнага дуалізму. Размова ідзе пра роўны ўдзел асоб каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў. Праўда, у пацвярджальным прывілеі Стэфана Баторыя (1580 года) пытанне суадносін «рымскай» і «рускай» («грэчаскай») частак магістрата не закранаецца.

— І гэта дазваляе меркаваць пра захаванне ўладамі ВКЛ у канцы XVI стагоддзя ранейшых падыходаў да гэтага пытання. Аднак пасля 1580 года, у сувязі з увядзеннем выбарнасці вышэйшых урааднікаў магістрата, сітуацыя ў пераважна праваслаўным Полацку магла значна адрозніваць ад стандарту, зацверджанага прававымі актамі. У канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя выбары «рымскай» і «рускай» частак магістрата ажыццяўляліся не паасобку — пры ўдзеле выключна прадстаўнікоў адпаведнай канфесіі, а сумесна — пры ўдзеле ўсіх мяшчан. Карыстаючыся гэтай сістэмай, праваслаўная большасць наўмысна абірала ў склад магістрата няпоўную колькасць самых нядзольных католікаў. І гэтым эфектыўна паралізавала дзейнасць каталіцкага лобі, — расказвае даследчык.

І ў выніку прыйшлося каталікам абараняць свае правы ў каралеўскім судзе. У лютым 1611 года яны прасілі караля Жыгімонта Вазу, каб той дазволіў абіраць «рымскую» палову магістрата без удзелу праваслаўных, «паколькі іншых галасоў заўсёды больш будзе». І манарх фармальна задаволіў просьбу. Аднак пазнейшыя матэрыялы не даюць ніякіх падстаў сцвярджаць, што каралеўскае рашэнне было рэалізавана на практыцы.

## За і супраць уніятаў

Пасля заключэння ў 1596 годзе Брэсцкай царкоўнай уніі да дзвюх ранейшых канфесій далучалася трэцяя.

Аднак у першыя дзесяцігоддзі існавання ўніяцкай царквы заўважнай колькасці яе прыхільнікаў у Полацку не было. І магістрат працягваў заставацца каталіцка-праваслаўным. Сітуацыя з распаўсюджваннем уніяцтва на землях Беларускага Падзвіння пачала мяняцца толькі ў трэцім дзесяцігоддзі XVII стагоддзя. У складзе полацкага магістрата ўніяты пачалі пераважаць над праваслаўнымі толькі пасля забойства 12 лістапада 1623 года ў Віцебску полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча.

— 11 сакавіка 1633 года кароль Уладзіслаў Ваза сваім прывілеем пацвердзіў прынцып парытэтнага прадстаўніцтва каталікоў і «русінаў» у магістраце Полацка. Аднак пад тэрмінам «русіны» ў згаданым дакуменце разумеліся ўжо выключна ўніяты. Такім чынам, пасля 1633 года праваслаўныя палачане былі афіцыйна пазбаўлены магчымасці займаць пасады гарадскіх ураднікаў. А тыя з іх, хто не змяніў веравызнанне, па ўсёй верагоднасці, мусілі выйсці са складу магістрата. З вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што з 1633 года да канца чэрвеня 1654-га ў полацкім магістраце засядалі толькі католікі і ўніяты, — канстатуе Максім Макараў.

У чэрвені 1654 года Полацк быў захоплены войскамі Маскоўскай дзяржавы. Большая частка мясцовых бурмістраў, райцаў і лаўнікаў збегла на захад ВКЛ. У складзе амаль цалкам абноўленага (і лаяльнага да адміністрацыі цара Аляксея Міхайлавіча) магістрата засталося ўсяго некалькі даваенных ураднікаў.

— Яны, згодна з логікай развіцця падзей, мусілі перайсці ў праваслаўе. Значную ж частку «новых людзей» полацкага магістрата склалі ідэйныя праціўнікі уніі. Напрыклад, у хуткім часе пасля 1654 года бурмістрам стаў Філіп Сямёнавіч Касабуцкі, які ў жніўні 1643 года ўдзельнічаў у акцыі полацкіх мяшчан па апаганьванні і знішчэнні абразоў святога Казіміра і святога Іасафата. Вельмі імклівую кар'еру пры царскай адміністрацыі зрабіў і мяшчанін Фёдар Аляксеевіч Саткоўскі, які ў 1646 годзе публічна казаў, што вера ўніяцкая не ад Бога, — удакладняе гісторык.

Па ўсёй верагоднасці, полацкі магістрат «маскоўскага» перыяду цалкам складаўся з праваслаўных.



План Полацка пачатку XVIII стагоддзя.

## Ракіроўкі дзяржслужачых

У 1667 годзе, пасля вяртання Полацка ў склад Рэчы Паспалітай, на пасадах «чыноўнікаў» ізноў апынуліся выключна католікі і ўніяты. У склад адноўленага магістрата ўвайшла толькі нязначная частка асоб, якія ўдзельнічалі ў рабоце гарадскіх улад у 1654—1667 гадах...

Многія ўраднікі «маскоўскага часу» пасля 1667 года не змянілі веравызнання і працягвалі жыць у Полацку. Але ўжо не займалі ніякіх афіцыйных пасад. Можна сказаць, што яны з'яўляліся нефармальнымі лідарамі праваслаўнай абшчыны, згуртаванай вакол брацтва пры Богаяўленскай царкве. Калі пасля 1680 года пад ціскам «нізоў» быў адноўлены такі орган гарадскіх улад, як «мужы гмінныя» (прадстаўніцтва мяшчан, што кантралявала фінансавую дзейнасць магістрата), у яго склад увайшло аж чатыры асобы, якія з'яўляліся ўраднікамі пры «царскай» адміністрацыі...

Вяртанне праваслаўных на пасады бурмістраў, райцаў і лаўнікаў адбылося ў гады Паўночнай вайны (1700—7721) ці, дакладней, каля 1708 года. У магістрацкіх дакументах за 1709 год згадваюцца наступныя ўраднікі праваслаўнага веравызнання: бурмістр Ян Сцебут, райца Абрам Снітка, лаўнікі Міхал Алавяшка, Аляксандр Вароніч, Грыгорый Дам'яновіч, Стафан Харкевіч.

> «У складзе полацкага магістрата ўніяты пачалі пераважаць над праваслаўнымі толькі пасля забойства 12 лістапада 1623 года ў Віцебску полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча.

— Характэрнай з'явай ва ўнутраным жыцці Полацка першай чвэрці XVIII стагоддзя стала масавае перасяленне мяшчан, галоўным чынам, каталіцкага і ўніяцкага веравызнанняў, у Бешанковічы, Друю і іншыя месцы Вялікага Княства Літоўскага. Разам з часткай мяшчан выехала таксама значная колькасць ураднікаў магістрата. 5 снежня 1725 года магістрат публічна прызнаў, што ў Полацку «мала маем католікаў з рымскага боку, а з грэчаскага — уніятаў». А мяшчане ў адказ на гэта прасілі, каб «русінам дазволілі займаць пасады». 16 лістапада 1726 года полацкі ваявода і войт Станіслаў Дэнгаф зацвердзіў праваслаўнага Аляксандра Міхайлавіча Сцебута на пасадзе бурмістра з наступнай фармуліроўкай: «з прычыны недахопу ўніятаў».

З гэтага часу і да 1772 года палова месцаў у полацкім магістраце была заўсёды занята католікамі і ўніятамі, другая — праваслаўнымі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

НУ І НУ!

## Выкінулі кіроўцу з аўто

**Пад Лідай трое мужчын з пісталетам напалі на таксіста.**

Па інфармацыі прэс-службы УУС Гродзенскага аблвыканкама, разбойны напад на кіроўцу таксі быў здзейснены побач з вёскай Пяскі Лідскага раёна. Пра гэта праваахоўнікам паведамілі сам пацярпелы. Трое невядомых, пагражаючы пісталетам, выкінулі кіроўцу з машыны, выкралі 200 рублёў і 20 долараў. Пасля гэтага яны селі ў аўтамабіль і паспрабавалі знікнуць. Але далёка падазраваныя не паехалі, бо трапілі ў дарожна-транспартнае здарэнне. У шасці раёнах вобласці быў уведзены план «Перахоп», неўзабаве былі знойдзеныя і аўтамабіль, і згоншчыкі.

Па словах падазраваных, перад нападам яны распівалі спіртное. У нейкі момант мужчынам захацелася прыгод, таму, выкраўшы ў таварыша пнеўматычны пісталет, пайшлі на справу. Усе яны раней ужо мелі праблемы з законам. Па артыкуле «Разбой» распачатая крымінальная справа.

## Міні-завод у глухім гушчары

**Вытворчасць самагону ліквідавалі праваахоўнікі ў Гродзенскім раёне. Пра яе міліцыянерам і супрацоўнікам Гродзенскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету паведамілі мясцовыя жыхары. Незаконны аб'ект размяшчаўся ў глухім гушчары каля вёскі Вярхполле.**

Аператыўная група заспела самагоншчыкаў знянацку. Адзін з іх, жыхар вёскі Новы Двор, узяў віну на сябе. Мяркуючы па вялікай тэрыторыі, якую забрудзілі адходамі нелегалы, апарат працаваў у лесе ўжо даўно. Адпрацаваная брага зліваласся з бака праз шланг як з пральнай машыны. У выніку на плошчы ў 600 квадратных метраў быў знішчаны лясны падсціл, нанесеная шкода ацэнена ў 600 базавых велічынь (13,8 тысячы рублёў), паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. За забруджванне лесу, якое пацягнула шкоду ў буйным памеры, прадугледжана крымінальнае пакаранне — папраўчыя работы і нават пазбаўленне волі. Разліччыца самагоншчыкам давядзецца і за ссечаныя для вогнішча 24 дрэвы аб'ёмам 8,5 кубаметра драўніны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2017 года.**